Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СНЕЖНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 242 (28352)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Беларусы ў люстэрку даследаванняў

СТАР. 4

Быць музею Адамовіча

СТАР. 15

Сямейная газета

Няхай дзіця малюе. На… шпалерах

■ Добрая навіна

НУМАР ПЕРШЫ

У Магілёве ўрачыста здалі першы ў краіне энергаэфектыўны дом

Ён першы нават па нумары і размешчаны на вуліцы імя Аркадзя Куляшова. Яшчэ два такія будынкі ўзводзяцца ў Мінску і Гродне. Але магілёўскія будаўнікі справіліся першымі. Дом стане родным для 160 шматдзетных сем'яў. Паветраныя шары, музыка, шчаслівыя ўсмешкі навасёлаў — падзея стала сапраўдным святам.

СТАР. 3

Фота БЕЛТА.

Сімвалічны ключ у руках навасёлаў – Паўла СВІШЧАНКОВА і яго сыноў Антона і Максіма.

ЛІЧБА ДНЯ

Не менш як $1,4 млрд

прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове плануе прыцягнуць Беларусь у 2017 годзе. Валавы ўнутраны прадукт плануецца нарасціць на 1,7 працэнта да ўзроўню 2016 года ў супастаўных цэнах. Мяркуецца, што прадукцыйнасць працы павялічыцца на 1,8 працэнта, экспарт тавараў і паслуг — на 3,8 працэнта, рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — на 1,3 працэнта. Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі складзе 0,1 працэнта. Індэкс спажывецкіх цэн не перавысіць 9 працэнтаў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.12.2016 г.

Долар ЗША	1,9548 ▲
Еўра	2,0817 ▲
Рас. руб.	0,0321 ▲
Укр. грыўня	0,0742 ▼

ISSN 1990 - 763X

■ Рынак працы

МІНЧАНЕ ШУКАЮЦЬ РАБОТУ ДАЎЖЭЙ ЗА ЎСІХ,

а ў асобных рэгіёнах вакансій больш, чым саіскальнікаў

Ужо восьмы месяц запар колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных зніжаецца. Калі ў маі ў гэтым статусе былі амаль 54 тысячы чалавек, то ў снежні — каля 36 тысяч. Цяпер узровень беспрацоўя складае 0,8 працэнта ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва.

Напружанасць на рынку таксама змяншаецца. На адну вакансію прыпадае адзін беспрацоўны (летась у снежні на свабоднае месца было 1,5 саіскальніка). А ў Мінску, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях вакансій больш, чым прэтэндэнтаў.

У сярэднім на пошук работы беларусам патрэбна 2,3 месяца. Што цікава: хутчэй за ўсіх удаецца ўладкавацца жыхарам Магілёўскай вобласці — за 1,9 месяца. А вось у мінчан на выбар патрэбнай працы ідзе 3,5 месяца.

Што да свабодных месцаў, то ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій іх налічваецца амаль 39 тысяч (на 21 працэнт больш, чым было год таму). Больш за палову з іх (52 працэнты) — па рабочых прафесіях. Самай запатрабаванай вакансіяй у наймальнікаў застаецца медыцынская сястра — 2200 свабодных месцаў. Традыцыйна патрэбны ўрачы-спецыялісты: у краіне не хапае 1875 медыкаў. Заробкі прапануюць розныя: 800 рублёў і больш гатовы плаціць на 55 вакансіях (амаль усе ў сталіцы) — напрыклад, неўролагу ў 11-й гарадской дзіцячай паліклініцы Мінска ці псіхатэрапеўту Столінскай цэнтральнай раённай бальніцы. Разам з тым 46 працэнтаў свабодных месцаў для ўрачоў — з заробкам да 400 рублёў (але трэба адзначыць, што многія з іх — гэта работа на чвэрць ці палову стаўкі).

СТАР. 3

■ Фінансы

У ФАЗЕ ЎПЭЎНЕНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

Сёння менавіта так ацэньваюць «здароўе» беларускай валюты нават незалежныя аналітыкі

Напрыклад, сур'ёзны эксперт на фінансавым рынку кампанія ТэлеТрэйд вырашыла прааналізаваць дынаміку банкаўскіх укладаў. Аказалася, што яны сёлета пачалі... скарачацца. Гэта і не дзіўна, бо рэальныя даходы большасці беларусаў ужо не павялічваюцца. Эксперт-аналітык кампаніі ў нашай краіне Жанна Кулакова адзначае, што цяпер раней зробленыя зберажэнні выдаткоўваюцца на спажыванне. Атрымліваецца, што няпростае фінансавае становішча прымушае людзей жыць па сродках. Гэта калі бягучых даходаў хапае на ўжо звыклы ўзровень жыцця. А калі не? У такім выпадку людзі пачынаюць скарачаць выдаткі або «праядаць» зробленыя раней назапашванні. Цікава, а як гэта можа паўплываць на фінансавае становішча нашага рубля? Паспрабуем разабрацца з калькулятарам у руках.

Не паклаўшы, не возьмеш

Намінальна рублёвыя дэпазіты за 10 месяцаў выраслі на 7,8% з 2,61 да 2,82 млрд рублёў. Аднак прырост з пачатку года не перавышае капіталізаваныя працэнты, а апошняе сведчыць аб тым, што новых грошай банкі па сутнасці не атрымалі. Па валютных укладах адток яшчэ больш відавочны. За 10 месяцаў аб'ём тэрміновых валютных укладаў фізічных асоб скараціўся з 7,69 да 7,07 млрд рублёў. У выніку з пачатку года нашы людзі забралі з банкаў кожны 12 -ы долар. У працэнтах скарачэнне склала амаль 8%.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Удасканальваецца заканадаўства па пенсійным забеспячэнні

Адпаведны ўказ №452 падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент павінен прывесці раней прынятыя рашэнні кіраўніка дзяржавы ў адпаведнасць з указам №137 ад 11 красавіка 2016 года «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння». Для гэтага прадугледжваецца іх карэкціроўка ў частцы ўдакладнення ўзросту, які з'яўляецца адным з крытэрыяў вызначэння працаздольнасці грамадзян пры назначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ў выглядзе штомесячнай дапамогі, а таксама дае права на льготны праезд пенсіянерам на перыяд сезонных сельскагаспадарчых работ штогод з 1 мая па 30 верасня.

Акрамя таго, удакладняецца ўзрост, у залежнасці ад якога прымаюцца рашэнні аб пастаноўцы на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў і аб праве на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, і ў адпаведнасці з якім вызначаецца тэрмін дзеяння кантракта, што заключаецца (падаўжаецца) з работнікам перадпенсійнага ўзросту.

■ Сацыяльны клопат

ПАМЕНШЫЦЬ БОЛЬ

Як дапамагчы дзеткам, што невылечна хворыя

Падчас пасяджэння Нацыянальнай камісіі па правах дзяцей прадстаўнікі ўрада, выканаўчай і заканадаўчай улады, Міністэрства аховы здароўя абмеркавалі, на якім узроўні знаходзіцца дапамога дзецям з захворваннямі, якія немагчыма вылечыць (паліятыўная дапамога).

Фота БЕЛТА.

Развіццё паліятыўнай дапамогі ў нашай краіне апошнім часам набыло асаблівую значнасць, — падчас наведвання Дома дзіцяці зазначыла **Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі.** — Больш чым 800 дзецям патрэбна такая дапамога. Многія з іх не маюць бацькоў, альбо тыя пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Сітуацыі бываюць розныя. У той жа час важна дапамагаць не толькі дзецям, але і іх родным.

Святлана МАЛАШКА, галоўны ўрач мінскага Дома дзіцяці №1 для дзяцей з арганічным пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі, расказала, што ўстанова спачатку была інтэрнатнага тыпу. Але ў 2002 годзе адкрыліся паліятыўныя палаты для дзяцей, якіх даглядаюць бацькі. Гэта тыя дзеці, якія маюць пасведчанне, што іх захворванне немагчыма вылечыць. «Мы даглядаем іх, аказваем сімптаматычнае лячэнне, бацькоў у наведваннях не абмяжоўваем. Такім чынам паляпшаем якасць жыцця дзетак і ўсёй сям'і. З бацькамі працуе псіхолаг, праводзіць заняткі, гутарыць для таго, каб захаваць сям'ю», — паведаміла яна. Ва ўстанове знаходзіцца 26 такіх асаблівых дзяцей, для якіх працуе 4 палаты паліятыўнай дапамогі.

Па словах Дзмітрыя ПІНЕВІЧА, першага намесніка міністра аховы здароўя, удасканаленне гэтай сферы — доля развітых краін. Пры гэтым цяпер мы можам казаць пра дапамогу не толькі напрыканцы жыцця, але і з нараджэння і далей. На думку першага намесніка міністра, кірункі вырашэння існуючых у сферы праблем — паляпшэнне заканадаўства, якасная перападрыхтоўка спецыялістаў, а таксама прыцягненне да сумеснай працы валанцёрскіх арганізацый і выкарыстанне замежнага вопыту.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■

■ Парламенцкі дзённік

Партнёры з Вялікабрытаніі

Якія кірункі ўзаемадзеяння з імі могуць быць перспектыўнымі для нас

Сфарміраваць групы дружбы ў парламентах нашай дзяржавы і Вялікабрытаніі прапануе старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. Пра гэта ён заявіў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Фіёнай Гіб.

Фота БЕЛТА.

Паводле слоў старшыні Савета Рэспублікі, Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні эканамічнага супрацоўніцтва з Вялікабрытаніяй. Тавараабарот паміж краінамі даволі высокі. Калі прааналізаваць яго структуру, то беларускі экспарт у асноўным прадстаўлены прадуктамі перапрацоўкі нафты, калійнымі ўгнаеннямі. «Гэта добра, але хацелася б дыверсіфікаваць структуру, каб таварная наменклатура была крыху шырэйшая», — адзначыў ён.

Спікер верхняй палаты таксама адзначыў, што Беларусь, у прыватнасці, зацікаўлена ў развіцці супрацоўніцтва ў хімічнай прамысловасці. Што да вытворчасці лекаў, наша дзяржава па гэтым напрамку цяпер працуе ў тым ліку з Індыяй, было б перспектыўна наладзіць узаемадзеянне і з кампаніямі з Вялікабрытаніі, дадаў спікер. Старшыня Савета Рэспублікі лічыць, што бакам неабходна абмеркаваць дагаворна-прававую базу, каб можна было развіваць супрацоўніцтва па асобных пытаннях эканамічнага, гуманітарнага, навукова-тэхнічнага ўзаемадзеяння.

Раман АЛЯХНОВІЧ

■

Традыцыя выхаднога дня

Прамыя тэлефонныя лініі ў суботу, 17 снежня, зноў будуць арганізаваны па ўсёй краіне. На сувязі з насельніцтвам кіраўнікі рэгіёнаў, гарадскіх і раённых адміністрацый. Каб расказаць пра свае праблемы, жыхарам вёсак альбо далёкіх гарадоў не прыйдзецца ехаць у вобласць. Звянкі будуць прымаць на месцах. Бо большасць спрэчных пытанняў можна вырашыць на пачатковым этапе. Першая палова выхаднога дня — з 9 раніцы і да поўдня — выбрана для зручнасці грамадзян, калі большасць з іх знаходзяцца дома і могуць спакойна датэлефанавацца і задаць свае пытанні прадстаўнікам улады.

Прамыя тэлефонныя лініі ў гэтую суботу правядуць:

Брэсцкі аблвыканкам: Ліс Анатоль Васільевіч — старшыня (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам: Шарстнёў Мікалай Мікалаевіч — старшыня (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам: Дворнік Уладзімір Андрэевіч — старшыня (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам: Шулейка Юрый Вітольдавіч — намеснік старшыні (80152735644);

Магілёўскі аблвыканкам: Харытончык Дзмітрый Іванавіч — намеснік старшыні (80222501869);

Мінскі аблвыканкам: Плаўскі Алег Альфрэдавіч — намеснік старшыні (5004160);

Мінскі гарвыканкам: Мацельская Ганна Мар'янаўна — кіраўнік спраў (2224444).

■ Блізкая ўлада

НАЯЎНАСЦЬ МОГІЛАК ТРЭБА ДАКАЗАЦЬ

Падчас прыёму грамадзян, які правёў старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА ў Маладзечне, традыцыйна сярод заяўнікаў знайшліся і тыя, хто прывык спадзявацца не на свае сілы, а перш за ўсё на дзяржаву. У прыватнасці, Святлана Уладзіміраўна сцвярджала, што яе дом непрыгодны для пражывання: затоплены вадой падвал, пастаянна вільготныя сцены. Жанчына прасіла пасадзейнічаць у правядзенні капітальнага рамонту адпаведнымі службамі.

Старшыня Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Яхнавец растлумачыў, што дом належыць прадпрыемству «Камунальнік». Пасля зваротаў жыльцоў гэта арганізацыя правяла бягучы рамонт: перакрыла дах і ўладкавала дзіцячую пляцоўку. «На наступны год абследуем сцены цеплавізарам і, калі становішча, пра якое паведамляе жанчына, пацвердзіцца, уключым дом у план капітальнага рамонту», — пракаментаваў званок Аляксандр Яхнавец. Аднак такі адказ не задаволіў жанчыну.

— У кожным раёне распрацаваны графікі чарговасці рамонту жылога фонду, уладкавання вуліц і дарог. Яны надрукаваны ў мясцовых газетах. Акрамя таго, створаны камісіі, якія вызначаюць стан аб'ектаў і вылучаюць тыя, якія ў першую чаргу патрабуюць рамонту. І я не маю права мяняць іх рашэнне. А калі ваш дом не трапіў у графік, то збірайцеся і зрабіце, як сапраўдныя гаспадары, усё неабходнае самі, — падтрымаў старшыню райвыканкама кіраўнік вобласці.

А вось задума прадпрымальніка Максіма Максіменкі губернатару спадабалася. Максім Уладзіміравіч хоча пабудаваць хлебазавод у мястэчку Радашковічы. Калісьці такое прадпрыемства паспяхова працавала. Цяпер, нягледзячы на тое, што ў мясцовых крамах дастатковы асартымент хлебабулачных вырабаў розных вытворцаў, мясцовыя жыхары сумуюць па тых «кірпічыках», якія выпускаў завод.

У свой час будынак былога хлебазавода набыў з аўкцыёна прыватнік. Затым завод неаднаразова перапрадаваўся. І вось нарэшце знайшоўся гаспадар, які хоча аднавіць развалiны, наладзіць вытворчасць і стварыць каля 100 працоўных месцаў, што таксама немалаважна для пасёлка: многія жыхары ездзяць на работу ў Мінск.

Іншыя заяўнікі, Ігар Уладзіміравіч і яго жонка Алена Яўгенаўна, расказалі кіраўніку рэгіёна, што яны купілі ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. Аднак пад слоем грунту знайшлі косці. Напачатку падумалі, што гэта астанкі жывёл. Але затым адкапалі чалавечы чэрап. Пра гэта паведамілі ў сельвыканкам, раённы аддзел унутраных спраў. Следчы камітэт па Маладзечанскім раёне правёў экспертызу рэшткаў. Да таго ж, фрагменты чалавечых шкілетаў знаходзілі і іншыя жыхары. Муж і жонка просяць кіраўніка цэнтральнага рэгіёна пасадзейнічаць ім у атрыманні новага зямельнага надзелу.

— Мы звярталіся ў пракуратуру, але там не маюць падстаў для рэагавання, паколькі не ўдалося знайсці дакументы, што тут калісьці былі могілкі. А значыць, мы не маем права на другі ўчастак. Узаконіць могілкі можа толькі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Ды для гэтага трэба папярэдне правесці раскопкі, якія пацягнуць на вялікую суму. Лішніх грошай у нас няма, — тлумачылі заяўнікі.

— Сапраўды, сітуацыя складаная, — пагадзіўся Сямён Шапіра. — Па законе вам нельга выдзеліць новы ўчастак. Аплаціць кошт работ з бюджэту мы таксама не маем права, паколькі зямля ў прыватнай уласнасці. Але мы можам звесці да мінімуму расходы. Пацяплее — выдзелім рабочых, тэхніку. Калі могілкі прызнаюць афіцыйна, вам дадуць у карыстанне іншы ўчастак.

Усяго старшыня аблвыканкама выслухаў 10 чалавек. Пытанні, якія не патрабуюць дадатковага вывучэння, былі вырашаны на месцы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by)

■

У ФАЗЕ ЎПЭЎНЕНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Эксперты ўпэўнены, што зараз мы маем справу не з ператокам грошай з рахунку на рахунак ці з валюты ў валюту, а з адтокам. Праўда, валюта, якая адбіраецца з банкаў, потым прадаецца на ўнутраным рынку, а атрыманыя рублі трапляюць у рэальны сектар эканомікі. Няўжо гэта для дзяржавы дрэнна? Пытанне не зусім простае. За студзень—кастрычнік беларусы на чыстай аснове прадалі 1,6 млрд долараў. У маштабах айчыннага рынку гэта вельмі шмат, і гэты фактар сёлета аказаў рублю вельмі добрую падтрымку, лічыць Жанна Кулакова.

Усякі грош харош?

Велізарнае значэнне для валютнага рынку мае сальда знешняга гандлю — гэта значыць, розніца паміж імпартам і экспартам. Калі экспарт будзе перавышаць імпарт, то прадпрыемствы не будуць праяўляць празмерны попыт на валюту. У першым паўгоддзі сітуацыя ў знешнім гандлі была не самай спрыяльнай, сальда сыходзіла ў мінус на некалькі соцень мільёнаў долараў, але цяпер усё выправілася, і сальда ўжо 4 месяцы запар станоўчае. Больш таго — станоўчым з'яўляецца і выніковы паказчык па сальда з пачатку года. За студзень—верасень экспарт перавысіў імпарт на 390,5 млн долараў. У выніку прадпрыемствы і іншыя юрасобы не праяўляюць на валюту значнага попыту. За студзень—кастрычнік яны купілі на чыстай аснове ўсяго 8 млн долараў, а ў маштабах макраэканомікі гэта практычна нуль. Адзначаная тэндэнцыя ўзмацнілася яшчэ і тым фактам, што нерэзідэнты ў гэты перыяд выступілі чыстымі прадаўцамі і прадалі 374,9 млн долараў. Усяго з боку насельніцтва, прадпрыемстваў і нерэзідэнтаў маем чысты прыток валюты на айчынны рынак 2 млрд долараў. А гэта ўжо сапраўды вельмі шмат, лічыць эксперт. Рубель з такім прытокам мог значна ўмацавацца, але гэтага не адбылося: з пачатку года ён знізіўся да долара на 4,7%, да еўра ўпаў на 1,6%, да расійскага рубля — амаль на 20%. Гэта пры тым, што валюты на ўнутраным рынку было з лішкам, а цэны на нафту і расійскі рубель выглядаюць значна лепш, чым у пачатку года.

Што вінен, аддаць павінен

Значную частку валюты, якую прадало насельніцтва і прадпрыемствы, купіў Нацбанк. Перад нашай краінай досыць востра стаіць праблема пагашэння валютнага дзяржаўнага доўгу. Сёлета агульная сума такіх плацяжоў перавышае 3 млрд долараў. Аб'ём золата-валютных рэзерваў (ЗВР) у Беларусі невялікі, таму валюта нам вельмі патрэбная.

У 2016 годзе дзяржаве ўдалося прыцягнуць 800 млн долараў за кошт крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця (ЕФСР), 1,3 млрд долараў за кошт валютных аблігацый на ўнутраным рынку, што ў суме дае ўжо больш за 2 млрд, астатняе далі экспартныя пошліны і купля валюты на ўнутраным рынку. У выніку краіна здолела абслужыць валютны дзяржаўны доўг і нават нарасціць ЗВР. Калі б не актыўнасць насельніцтва, якое прадало звыш 1,6 млрд долараў, сітуацыя на валютным рынку была б значна больш напружанай.

Загляне сонца і ў наша аконца

Наступны год для нашай фінансавай сістэмы абяцае стаць таксама складаным. Налета абслугоўванне валютнага дзяржаўнага доўгу запатрабуе адшукаць каля 2,3 млрд долараў. Сума вялікая, але гэта ўжо крыху менш, чым сёлета. Плануецца прыцягнуць 700 млн долараў за кошт крэдыту ЕФСР, 800 млн долараў за кошт размяшчэння еўрабондаў, а таксама 360 млн долараў за кошт продажу аблігацый на ўнутраным рынку. У суме атрымліваецца 1,86 млрд, а астатнія 450 млн долараў прынясуць краіне экспартныя пошліны і купля Нацбанкам валюты на ўнутраным рынку. Калі гэты план цалкам удасца ажыццявіць на практыцы, то рублю ў найбліжэйшы час нічога не пагражае, упэўнены фінансавыя эксперты. Праблемы на валютным рынку могуць пачацца ў выпадку, калі сальда знешняга гандлю стане адмоўным, ці калі дзяржаўным органам не ўдасца рэалізаваць усе запланаваныя запазычанні або калі адбудуцца нейкія знешнія шокі. Аднак у найбліжэйшы час бягучыя тэндэнцыі, хутчэй за ўсё, захаваюцца, упэўнена эксперт-аналітык, і рубель будзе адчуваць сябе нядрэнна.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Кропкі над «і»

КАЛІ ПРАВЕРКА — НЯПРАВІЛЬНАЯ

Нашы прадпрыемствы пакутуюць ад памылак суседскіх кантралёраў

Неадпаведнасці ў беларускай прадукцыі, што выяўляюцца, — прамое следства парушэнняў «Рассельгаснагляду» пры адборы проб. Пра гэта заявіў БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча Аляксей БАГДАНАЎ.

Ён растлумачыў, што перыяд ад адбору проб прадукцыі да правядзення даследавання рэгламентаваны адпаведнымі нарматывамі, якія «Рассельгаснагляд» ігнаруе. «Мы па пратаколах «Рассельгаснагляду» бачым, што ад адбору проб да дастаўкі іх у лабараторыі праходзіць ад 3 да 11 дзён. Хоць на дастаўку проб мяса астуджанай курыцы да лабараторыі, напрыклад, павінна адводзіцца 6 гадзін. А ў цэлым тэрмін прыдатнасці для рэалізацыі астуджанага мяса птушак складае 5 сутак. Таму пры такіх парушэннях ва ўжо сапсаваных спецыялістамі «Рассельгаснагляду» пробах можна не толькі лістэр знайсці, але і ўсё, што пажадаеце», — абурыўся прадстаўнік Мінсельгасхарча.

Аляксей Багданаў нагадаў, што заканадаўства ЕАЭС прадугледжвае правядзенне адбору проб на прадпрыемствах-вытворцах альбо ў пункце выгрузкі тавару. «Але ні ў якім разе не пры перавозцы або ў пунктах продажу тавараў. Таму што ў такіх выпадках вытворца адказнасці за тавар не нясе — ён не ведае пра ўмовы перавозкі, захоўвання прадуктаў», — сказаў Аляксей Багданаў. У гэтай сувязі начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча асабліва падкрэсліў, што менавіта парушэнні рэгламентаў пры працэдурах адбору проб беларускай прадукцыі, захоўвання і транспарціроўкі проб прадстаўнікамі «Рассельгаснагляду» прыводзяць да таго, што яны знаходзяць у беларускіх прадуктах якія-небудзь неадпаведнасці.

Прадстаўнік Мінсельгасхарча пракаментаваў сітуацыю з закрыццём некаторых беларускіх прадпрыемстваў. Прычына таму — падробкі беларускай прадукцыі на расійскім рынку, адносін да якіх нашы кампаніі не маюць. «На расійскім рынку вельмі шмат парушэнняў з пункту гледжання фальсіфікату. Напрыклад, у рэгіёнах Расіі на складзе або паліцы крамы бярэцца проба прадукцыі аднаго з беларускіх малочных заводаў. Выяўляецца нібыта неадпаведнасць па тлушчавым або бялковым балансе, па іншых параметрах. Потым выстаўляецца прэтэнзія з боку Расіі, і беларускае прадпрыемства закрываецца. Пры правядзенні разбору аказваецца, што прадукцыя — фальсіфікат: выраблена ў Расіі на падпольным заводзе пад маркай «Зроблена ў Беларусі». Абсалютна невінаватае беларускае прадпрыемства закрываецца «Рассельгаснаглядам». Прычым тут Беларусь, наогул незразумела!» — заўважыў Аляксей Багданаў, назваўшы пазіцыю «Рассельгаснагляду» прадузятай у адносінах да беларускіх прадуктаў харчавання. Пры гэтым ён падкрэсліў: «Мы не супраць кантролю, але давайце гэта рабіць у рамках рэгламентаў і законаў, якія мы разам прымалі на агульнай пляцоўцы ЕАЭС».

У цэлым адносна аб'ёму экспарту прадукцыі арганізацый Мінсельгасхарча начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці ведамства інфармаваў, што за 10 месяцаў гэтага года ён склаў $1 млрд 866 млн — 98,5% да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Пры гэтым у агульным аб'ёме экспарту на долю паставак у Расію прыпадае 94%. У студзені—кастрычніку ў расійскія рэгіёны адгружана прадукцыі на суму $1 млрд 764 млн (98,9% да ўзроўню студзеня—кастрычніка 2015 года). Экспарт мяса птушкі ў натуральным выражэнні ў студзені—кастрычніку павялічыўся на 7,6%, каўбасных вырабаў — на 65%, вырабаў з мяса — на 26%, сыроў і тварагу — на 16,2%, сухой сыроваткі і канцэнтратаў — на 11%, мукі — у 4 разы.

«Па прагнозах, тэмп росту аб'ёму экспарту па выніках года складзе не менш за 100% да ўзроўню мінулага года», — адзначыў суразмоўца, удакладніўшы пры гэтым, што, нягледзячы на высокі рост аб'ёмаў паставак у натуральным выражэнні, адзначаецца нізкі ўзровень коштаў да ўзроўню мінулага года. Аляксей Багданаў таксама сказаў, што Мінсельгасхарч актыўна працуе над дыверсіфікацыяй беларускага экспарту: у студзені—кастрычніку гэтага года арганізацыі ведамства пастаўлялі прадукцыю на рынкі 58 краін свету супраць 51 краіны за аналагічны леташні перыяд.

■ Падпіска-2017

Час цёплых сустрэч на Міншчыне

Зіма ўступіла ў свае правы, але гэта зусім не перашкода для нашых сустрэч з чытачамі.

Звяздоўцы ўжо пабачыліся з падпісчыкамі газеты ў самых розных кутках Беларусі.

Мы аб'ехалі ўсе вобласці, правялі сустрэчы ў сталіцы. І ўсюды пераконваліся: «Звязду» любяць, чытаюць і чакаюць. Зразумела, такі чалавечы фармат і нас у сваю чаргу належным чынам абавязвае. Перш за ўсё — штодня ствараць родную газету на роднай мове. І па магчымасці як мага часцей сустракацца з тымі людзьмі, дзеля якіх, уласна, і працуем. Бо газета без зваротнай сувязі — проста стос паперы.

Таму гэтымі прыгожымі снежаньскімі днямі вырашана правесці глабальны Дзень падпісчыка «Звязды»: мы завітаем на Міншчыну — адразу ў тры раёны. Такім чынам, **16 снежня Дзень падпісчыка адбудзецца: на Стаўбцоўскім раённым вузле паштовай сувязі (РВПС) — з 10 да 13 гадзін, Лагойскім РВПС — з 11 да 14 гадзін, на Клецкім РВПС — з 12 да 15 гадзін.**

Па добрай завядзёнцы кожны, хто падпішацца, атрымае адметны звяздоўскі падарунак.

Прыходзьце — сумаваць не давядзецца!

МІНЧАНЕ ШУКАЮЦЬ РАБОТУ ДАЎЖЭЙ ЗА ЎСІХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Актыўна шукаюць прадаўцоў — 1,1 тысячы вакансій. Большасць прапаноў у рэгіёнах: работнікі за касай патрэбны ў Добрушы, Наваполацку, Пружанах, Рагачове, Капылі. Амаль столькі ж свабодных месцаў налічваецца для кіроўцаў. Плацяць, праўда, нямнога — толькі пятая частка наймальнікаў прапануе 600 рублёў у месяц і больш: 650 рублёў абяцаюць кіроўцу ў Краснапольскім лясгасе, 900 — у мінскім аўтобусным парку №4.

Нечакана сярод запатрабаваных прафесій аказаліся прыбіральшчыкі памяшканняў (апошнія два гады такія вакансіі былі ў дэфіцыце). Прапаноў — паўтысячы, грошай — у асноўным да 300 рублёў у месяц.

Саіскальнікаў жа часцей цікавяць месцы эканаміста, бухгалтара, інжынера і сакратара.

Як паведамляюць у Міністэрстве працы і сацабароны, усяго з пачатку года пры садзейнічанні службы занятасці ўладкавана на пастаянную работу 150 тысяч чалавек, з іх 101 тысяча беспрацоўных. На вучобу па запатрабаваных прафесіях накіравалі каля 11 тысяч грамадзян. 144 сям'і перасялілі на новае месца жыхарства і працы. Яшчэ 1,6 тысячы беспрацоўных атрымалі субсідыі на арганізацыю прадпрымальніцтва, рамесніцтва, дзейнасці ў сферы аграэкатурызму.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

НУМАР ПЕРШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Прыемна напярэдадні Новага года і Раства здаваць у эксплуатацыю такі вельмі важны сацыяльны аб'ект, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** — Гэты дом незвычайны тым, што пабудаваны па новых тэхналогіях. Я мяркую, што жыхары ўжо праз год адчуюць усе перавагі жыцця ў ім. Разам з імі будзем ацэньваць эфектыўнасць абсталявання. У далейшым будзем прымяняць такую тэхналогію на іншых аб'ектах жыллёвага будавання Магілёўскай вобласці.

Пасля ўрачыстай цырыманіі адкрыцця і перарэзання чырвонай стужкі жыхары мелі магчымасць ацаніць сваё будучае жыллё, праўда, пакуль умоўна. Бо лёсаванне і ўручэнне ключоў ад кватэр яшчэ наперадзе. Пакуль сімвалічны ключ атрымалі Марына Варанцова і Павел Свішчанкоў, якія выхоўваюць траіх дзяцей. Сям'я атрымала ў новым доме трохпакаёўку. Свае эмоцыі Павел і Марына выказалі адным словам: «Крута!» Тры гады стаялі на чарзе і тут такое шчасце.

— Гэты дом — першы ў Беларусі энергаэфектыўны другога пакалення, які быў спраектаваны спецыялістамі і пабудаваны ў Беларусі пры падтрымцы праграмы ААН і Глабальнага экалагічнага фонду. Праграма развіцця ААН уклала ў яго мільён долараў, — паведаміла **Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі.** — Але тыя сонечныя панелі і цеплавыя вузлы, якія ўсталяваны ў доме, не простыя. Нават сцёкавыя воды, якія ўтворацца тут, будуць выкарыстоўвацца для цяпла. Галоўная мэта — знізіць спажыванне энергіі ў два разы і абмежаваць выкіды парніковага газу, які ўплывае на змяненне клімату. У гэтым доме будзе расці новае пакаленне беларусаў, для якіх такі эканамічны падыход стане прыкладам у жыцці. Беларусь 15 гадоў таму прыняла новыя энергаэфектыўныя стандарты, чым вельмі выгадна стала адрозніваца ад іншых краін на постсавецкай прасторы.

Унутры дома ўсё прадумана да дробязяў. Нават ёсць спецыяльныя замкі на вокнах, якія не дадуць выпасці дзіцяці. А галоўнае, сем'і змогуць значна эканоміць. «Штомесячныя камунальныя выдаткі будуць такія ж, як у любым іншым доме, але ў тры разы меншыя за цяпло, — удакладняе **Аляксандр ГРАБЯНЬКОЎ, кіраўнік праекта ПРААН і Глабальнага экалагічнага фонду па павышэнні энергаэфектыўнасці жылых будынкаў.** — Абслугоўваннем дома зоймецца звычайная жыллёва-эксплуатацыйная арганізацыя. На працягу паўтара года будзем вучыць спецыялістаў, як працаваць. Тая сістэма, якая тут усталявана, не складаная. Галоўнае, каб ніхто не спрабаваў парушыць яе. Будзем тлумачыць жыхарам, наколькі гэта важна».

Наперадзе яшчэ канчатковая аздоба кватэр. Але людзі шчаслівыя. «Гэты дом найлепшы, — падзялілася адна шматдзетная маці. — Да таго ж блізка дзіцячы садок, школа, крамы таксама. Усё проста супер!» Самі кватэры невялікія, але тыя сем'і, якім трэба большая плошча, зойміць адначасова дзве. Гэта вельмі зручна.

Будаўнікі таксама задаволены.

— Улічваючы, што гэта першы дом, а камунікацыі ў ім маюць свае асаблівасці, то адпаведна іх мантаж і ўсталяванне былі для нас першым досведам, — прызнаўся **начальнік гарадскога ўпраўлення камунальнага будаўніцтва Андрэй МАСКАЛЁЎ.** — Але ўсе пытанні, якія ўзнікалі па праекце, вырашаліся ў ходзе будаўніцтва. Дом унікальны. На яго даху размешчана 320 квадратных метраў сонечных батарэй. Яны будуць назапашваць і ператвараць сонечную энергію ў цеплавую і падаграваць ваду.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

■ Віншуем!

АДЗНАЧАНЫ СПАРТЫЎНЫЯ ТАЛЕНТЫ

Цырымонія ўручэння пасведчанняў стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба прайшла ў Зале алімпійскай славы НАК

Ужо больш за дзесяць гадоў Прэзідэнцкі спартыўны клуб падтрымлівае маладых, перспектыўных атлетаў і трэнераў краіны. На гэты раз у лік абраных трапілі найлепшыя прадстаўнікі трыццаці трох відаў спорту. У 2016 годзе яны занялі высокія месцы на найбуйнейшых міжнародных спаборніцтвах: з 182 спартсменаў-стыпендыятаў 158 падымаліся на п'едэстал, астатнія трапілі ў васьмёрку наймацнейшых. Пераможцамі сусветных і еўрапейскіх першынстваў сталі 36 спартсменаў. Сярод іх біятланістка Дар'я Блашко, канькабежац Ігнат Галавацюк, лёгкаатлетка Эльвіра Герман, тэнісістка Вера Лапко, дзюдаіст Дзмітрый Мінькоў і іншыя. Акрамя таго, стыпендыятамі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба сталі 28 трэнераў-выкладчыкаў.

— Некаторыя з удзельнікаў гэтага праекта ўжо прайшлі шлях ад юніёра, які толькі падае надзеі, да атлета, уключанага ў Залу алімпійскай славы беларускага спорту. Шматлікія прызёры Алімпіяды 2016 года ў Рыа ў розны час з'яўляліся стыпендыятамі клуба, а ў складзе ўсёй беларускай дэлегацыі іх колькасць упершыню дасягнула 66%, — адзначыў **старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.**

Маладых спартсменаў з уручэннем імянных стыпендый павіншавалі таксама першы віцэ-прэзідэнт НАК, памочнік Прэзідэнта Беларусі па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў, першы намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр Гагіеў, а таксама алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы Марына Лобач.

Фота БЕЛТА.

Старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА ўручае пасведчанне Паліне КАЦЭВІЧ (акадэмічнае веславанне).

Самая высокая стыпендыя ў 2017 годзе складзе 18240 беларускіх рублёў у год (з улікам 20% надбаўкі за прагрэс). Мінімальная прызначаная стыпендыя — 1896 рублёў у год.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■

Мы паедзем-паімчымся... у самы Новы год!

Навагоднія святкаванні для 70 выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу пачаліся з катання на алені, якога прывёз заапарк «Сірын» пад самыя дзверы тэатра-караоке «Багема», што ў Мінску.

Фота Надзеі БУЖАН.

Учора тут стартавала рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы сэрцы — дзецям», якая праходзіць у межах акцыі «Нашы дзеці» і якую вось ужо 25 гадоў запар арганізуе Беларускі дзіцячы фонд.

Кіраўнік творчай майстэрні «Трыумф-арт» Марына Куцко падрыхтавала творчую частку дабрачыннай навагодняй праграмы. А яшчэ былі конкурсы, мыльныя бурбалкі, карагоды з трохметровай пандай і майстар-класы валанцёраў Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў.

Акцыя працягнецца да 10 студзеня ва ўсіх абласцях і раёнах, а ў сталіцы Дзіцячы фонд разам з артыстамі і валанцёрамі наведае дзіцячыя аддзяленні бальніц: 22 снежня — РНПЦ псіхічнага здароўя, 26-га — дзіцячае апёкавае гарадской клінічнай бальніцы хуткай меддапамогі, 27-га — дзіцячае траўматалагічнае 6-й бальніцы, 28-га — Рэспубліканскі дзіцячы кардыялагічны цэнтр і іншыя.

Акцыю падтрымалі вядомыя дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы, сярод якіх «Цэптар Інтэрнацыянал», «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», «Чырвоны харчавік», «Чырвоны мазыранін», ЦУМ.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■ Грамадская думка

БУФЕР НА ПЕРАКРЫЖАВАННІ

Для таго каб зразумець нашы ментальныя каштоўнасці, трэба ведаць, што мы думаем пра сябе, пра суседзяў і што яны думаюць пра нас

Як вымяраюцца каштоўнасці нашага менталітэту? Беларусы лічаць сябе працаздольнымі, але не законапаслухмянымі? Ці сапраўды маштабы карупцыі ў нашай краіне СМІ перабольшваюць? Чаму значнае павелічэнне матэрыяльнага дабрабыту перашкаджае нараджальнасці? Як моладзь ставіцца да беларускай мовы? Прафесар Віктар КІРЫЕНКА разважае пра гэта і многае іншае на падставе праведзеных сацыялагічных даследаванняў.

Асноўныя навуковыя інтарэсы прарэктара Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога, доктара сацыялагічных навук, прафесара Віктара Кірыенкі — у галіне даследавання менталітэту славян і інтэграцыйных працэсаў. Адначасова ён займаецца і прыкладнымі даследаваннямі, якія дапамагаюць зразумець, што адбываецца сёння ў нашым грамадстве. Яго адміністрацыйная адказнасць — навучальная і выхаваўчая работа, таму ўсё, што адбываецца ў студэнцкім асяроддзі, прафесара хвалюе таксама.

— Паколькі грамадства зараз жыве складаным, неадназначным жыццём, з'яўляецца патрэба зразумець, чаму гэта адбываецца, якія прычыны ляжаць у аснове працэсаў: эканамічныя, палітычныя, псіхалагічныя і г.д. Прыкладная сацыялогія, у тым ліку рэгіянальная, закліканая разбірацца ў няпростых з'явах. Нават для Беларусі, якая з'яўляецца адносна невялікай краінай, відавочна розная арганізацыя сацыяльнага жыцця ў розных рэгіёнах. Гомельшчына — гэта яе паўднёвы ўсход. Вобласць адрозніваецца не толькі па кліматычных умовах, але і па гістарычных аспектах фарміравання і ўзаемадзеяння. Наш рэгіён фарміраваўся ў моцным узаемадзеянні з расійскім і ўкраінскім насельніцтвам. А, напрыклад, Гродзеншчына — ва ўмовах уплыву польскай і літоўскай культур. І гэта сёння трэба ўлічваць, калі мы кажам пра інтэграцыйныя працэсы і пра тое, што хвалюе і натхняе людзей... Дарэчы, гэта трэба шукаць і ў працэсах узаемадзеяння. Мы даўно вядзём тэму праблем і перспектыў беларуска-расійска-ўкраінскага памежжа. Нас аб'ядноўваюць не толькі падобныя мовы, але і вельмі складаная і часам супярэчлівая гісторыя. Аднак яна аптымістычная, бо заўсёды знаходзіўся выхад са складаных сітуацый. У нас жа ніколі не даходзіла да крывавых разборак. Дык вось яднанне гэтых бакоў і дазваляе інтэграваць у Беларусь усё самае лепшае, што было сфарміравана і на Захадзе, і на Усходзе. Мы нацыя, якая абсалютна адбылася. Гэта відавочна.

— Нам дакладна не пагражае сепаратызм?

— Калі я вывучаў менталітэт беларусаў — звяртаў увагу на ўласцівасці, якія на падсвядомым узроўні вызначаюць межы — дзе заканчваемся «мы» і дзе пачынаюцца «іншыя». Усе сусветныя недарэчнасці адбываюцца ў тым ліку таму, што этнічныя межы не адпавядаюць дзяржаўным. Згадаем курдаў — у палітычным плане яны разрознены, а ў ментальным прадстаўнікі этнасу гэтага не адчуваюць, і таму курды будуць адвечным ачагом напружання для краін, дзе жывуць. У беларусаў у сілу розных прычын падстаў для аналагічных з'яў няма. У нас з суседзямі карані вельмі пераплятліся. Мы ж буфер на перакрыжаванні Усходу і Захаду, Поўначы і Поўдня. Беларусь вымушана была з аднаго боку супрацьстаяць умяшанню, а з іншага — у талерантнай форме прымаць асаблівасці іншых культур.

— Наша геаграфічнае становішча навучыла нас ісці на кампраміс?

— Так. У гэтым і выяўляецца талерантнасць беларусаў. Таму і мірна жывуць тут побач праваслаўныя і католікі, пратэстанты і мусульмане... Толькі ў нас па два дзяржаўныя святы Раства і Вялікадня. У іншых дзяржавах прызнаюць толькі адно ў якасці дзяржаўнага.

— Віктар Васільевіч, а якая роля сацыялогіі ў гэтых складаных пытаннях?

— Мы праводзілі міжкраіннае даследаванне. Калі правялі вымярэнне сацыякультурных індыкатараў у палякаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, і беларусаў, якія жывуць на тэрыторыі Польшчы, аказалася, што ў беларускіх палякаў агульнага з беларусамі больш, чым у беларусаў, якія жывуць у Польшчы, — з беларусамі. Гэта ўвогуле складанае пытанне. Менталітэт вызначае, дзе заканчваюцца «нашы» і дзе пачынаюцца «не нашы». Даследаванні таксама паказалі, што рускія, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, адчуваюць сябе больш беларусамі, чым беларусы на тэрыторыі Расіі. Тады мы змаглі зрабіць выснову і паказаць: так, нацыя сфарміравалася. Мы ў тых межах, якія ёсць. Больш нам не трэба, але і менш таксама.

— Як сацыёлагі праводзяць свае вымярэнні?

— Калі мы кажам пра каштоўнасці нашага менталітэту, мы вымяраем не толькі тое, што кажуць беларусы самі пра сябе. Для таго каб зразумець нашы ментальныя каштоўнасці, нам трэба ведаць, што думаюць пра нас суседзі, што мы думаем пра іх, наколькі давяраем. Мы вымералі, што думаем пра сябе, пра рускіх, украінцаў, палякаў. Важна і тое, што яны пра нас думаюць — тады выбудоўваецца шкала даверанасці. Напрыклад, беларусы сябе лічаць працаздольнымі. І гэту ж якасць пацвердзілі нашы суседзі — рускія і палякі. Беларусы вызначаюць у сябе нізкі ўзровень законапаслухмянасці. Гэтую ж якасць пацвярджаюць у нас і суседзі. Славяне імкнуцца да законаў сумлення, у адрозненне, напрыклад, ад немцаў, якія паважаюць законы юрыдычныя. У нас сям'я вельмі многа значыць, у адрозненне ад амерыканцаў. Ступень стыкоўкі пэўных культур залежыць ад гэтага — наколькі прадуктыўна мы можам узаемадзейнічаць.

— Якім чынам складаюцца пытанні для вашых даследаванняў?

— Наш рабочы інструмент — гэта анкета. Перад тым як яе скласці, праводзім вялікую падрыхтоўчую работу. Прыкладныя сацыёлагі звычайна самі фармулююць задачу даследавання. Яе пастаноўка патрабуе вывучыць сутнасць праблемы. Нам кажуць, напрыклад: даследаваць грамадскую думку аб карупцыі. Дарэчы, у Сярэдняй Азіі шчыра ўпэўнены, што ў іх няма карупцыі. Кажуць: «Я даў падарунак, а чалавек мне за гэта нешта зрабіў. Якая тут карупцыя?» Такая ўсходняя культура. Нам жа трэба метадалагічна разабрацца ў сутнасці карупцыі ва ўяўленні беларусаў. Што з'яўляецца карупцыяй, што — з'явай, падобнай на карупцыю, а што для людзей не ўваходзіць у гэта паняцце. Трэба зразумець, адкуль яна ўзнікае — з якіх грамадскіх адносін, з якіх культурных слаёў. Мы даследуем, адкуль людзі даведваюцца пра карупцыю. Варыянты адказаў на пытанні: а) ад саміх сябе — калі зведаў дзеянні карупцыянера; б) ад блізкіх сваякоў; в) ад сваіх сяброў; г) з крыніц масавай інфармацыі. Дык вось, найбольш упэўнены, што карупцыя ёсць, тыя людзі, хто абсалютна давярае СМІ. І далей у зваротнай паслядоўнасці.

— Такім чынам, вы хочаце сказаць, СМІ значна перабольшваюць маштабы карупцыі ў нашай краіне?

— Так адказалі людзі. Пры гэтым СМІ — гэта, па сутнасці, аднабаковая сувязь, бо чалавек не можа напрамую ў іх спытаць ці ўдакладніць нешта. Таму СМІ сёння ўжо не чацвёртая ўлада, яны ўсё больш прабіраюцца наперад. Мы даследавалі талерантныя адносіны ў залежнасці ад ладу жыцця людзей. Пыталі: што вы робіце, каб збалансаваць свае выдаткі з прыбыткамі? Былі варыянты адказаў: а) шукаю магчымасць падпрацоўкі; б) шыю, рамантую сам сабе; в) вырошчваю гародніну; г) атрымліваю дадатковую адукацыю; д) нічога не раблю. Цікава, што самымі незадаволенымі аказаліся тыя, хто нічога не робіць. Такая пазіцыя: «Я сам нічога не раблю, але лічу, што ўсё няправільна». Таму ў нас немагчыма пабудаваць рынкавыя адносіны, аналагічныя амерыканскім ці еўрапейскім.

— У такім выпадку звычайна кажуць пра свой шлях. Які ён у нас?

— Калі азначыць сучасным тэрмінам — сацыяльна арыентаваная эканоміка. Амерыканцу скажы такое, ён не зразумее — што значыць рынак, сацыяльна арыентаваны? Увогуле рынак у ідэальным уяўленні ёсць толькі ў кніжках. А ў якой краіне няма дзяржаўнага рэгулявання эканомікі? Гэтыя тавары дазволіць да продажу, гэтыя не дазволіць... Гэта аплата фермеру за тое, што ён не вырошчвае пэўныя культуры... Такім чынам эканоміка паўсюдна рэгулюецца. Да таго ж у Беларусі, як і на ўсёй постсавецкай прасторы, да рынкавых адносін прыходзілі інакш, чым у Еўропе. Той жа нямецкі рынак будаваўся паступова і паслядоўна. Рамеснік сёння шыў боты, заўтра наняў работніка, потым яшчэ аднаго, потым арганізаваў вытворчасць. У постсавецкіх краінах спачатку стварылі ўсё дзяржавай, а потым пачалі думаць, як гэта прыватызаваць. Які рынак сфарміраваўся там, дзе пайшлі па шляху прыватызацыі? Напрыклад, расфарміравалі калгасы. Старшыня прыватызаваў самы смачны кавалак, за ім дасталося галоўнаму аграному з галоўным бухгалтарам, а вось радавым калгаснікам — тры колы ад трактара. Што з імі рабіць? Як арганізаваць таварную вытворчасць, каб яна працавала? Таму такія і вынікі. Чаму перыядычна ўзнікаюць «харчовыя войны»? Гэта войны людзей, якія кантралююць продаж нейкіх тавараў, і ім не патрэбны канкурэнты. Канкурэнцыі ў чыстым выглядзе сёння няма.

— Віктар Васільевіч, развейце самыя распаўсюджаныя міфы грамадства, якія абвяргаюцца вашымі сацыялагічнымі даследаваннямі.

— Не сакрэт, што ў штодзённай свядомасці існуе сувязь паміж зарплатай і якасцю працы. Часта можна пачуць: калі мне стануць больш плаціць, я буду лепш працаваць. Мы метадалагічна раскладаем праблему і пачынаем супастаўляць з пытаннямі-фільтрамі, якія правяраюць інфармацыю. Значная частка з нас хоча жыць матэрыяльна лепш. Пачынаем вывучаць матывацыйны механізм: што чалавек робіць для таго, каб лепш жыць і больш якасна працаваць. Аказваецца, гэта сувязь для сацыялогіі зусім іншая. Ці наконт вырашэння дэмаграфічных праблем. Часта кажуць: не хапае грошай, жылля і гэтак далей... Калі мы робім глыбінныя даследаванні, аказваецца, што сувязь паміж нараджальнасцю і дабрабытам вельмі складаная. Сапраўды, спачатку, па меры павелічэння матэрыяльнага дабрабыту нараджальнасць пачынае павышацца, але потым, дасягнуўшы пэўнага ўзроўню, яна пачынае рэзка падаць. Павелічэнне матэрыяльнага дабрабыту пасля пэўнай кропкі перастае спрыяць нараджэнню дзяцей. Яны перашкаджаюць кар'еры, вандроўкам, адпачынку і гэтак далей. У сацыяльных працэсах адсутнічае лінейная сувязь. Змяненне аднаго фактара, які сёння станоўча змяняе іншы фактар, заўтра можа змяніць яго ў супрацьлеглы бок. Таму мы павінны разумець, дзе што ідзе на дабро, а што на шкоду.

Беларусы вызначаюць у сябе нізкі ўзровень законапаслухмянасці. Гэтую ж якасць пацвярджаюць у нас і суседзі. Славяне імкнуцца да законаў сумлення, у адрозненне, напрыклад, ад немцаў, якія паважаюць законы юрыдычныя.

— Віктар Васільевіч, раскажыце пра ваша ўзаемадзеянне з Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў, які існуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

— Як і ўсе навукоўцы, мы карыстаемся метадалагічнымі напрацоўкамі адно аднаго. Да таго ж адно з правілаў сацыялогіі — атрымаўшы свае вынікі, абавязкова трэба зверыць іх з вынікамі падобных даследаванняў, праведзеных іншымі ўстановамі. Часта мы ўдзельнічаем у адных дзяржаўных праграмах. Напрыклад, нядаўна — у вывучэнні электаральных паводзін на выбарах. Нашы вучоныя часта ўдзельнічаюць у агульных канферэнцыях, мы пішам артыкулы для нашага часопіса «Сацыялогія». Мы вучымся і кантралюем адно аднаго.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Літаратурныя сувязі

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ — НА ТАТАРСКАЙ МОВЕ

Юбілей Багдановіча стаў прадметам увагі і на расійскіх прасторах. У прыватнасці, у Казані (Татарстан) надрукаваны новыя пераклады вершаў класіка беларускай паэзіі на татарскую мову.

Яшчэ раней адзін з вершаў і байку Максіма Багдановіча стварыў нанава вядомы татарскі паэт Закі Нуры. Першы твор быў надрукаваны ў калектыўным зборніку беларускай паэзіі — «Беларускія паэты», які пабачыў свет у 1968 годзе. Другі — у часопісе «Казан утлары» («Агні Казані» — першы нумар за 1980 год). Закі Нуры, які нарадзіўся ў 1921 годзе, у час Вялікай Айчыннай вайны змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі. Быў начальнікам разведкі партызанскага атрада Канстанціна Заслонава. Некаторы час пасля вызвалення Беларусі працаваў у Оршы. Закі Нуры быў вельмі ўважлівы да творчасці Янкі Купалы. Напісаў артыкулы пра народнага песняра Беларусі, яго повязь з татарскай літаратурай — «Паэт-патрыёт беларускага народа» (1957 год), «Янка Купала і яго нашчадкі» (1972 год). Пераклаў цэлы шэраг вершаў Купалы — «З кутка жаданняў...», «Усюды лета», «Мая навука», «Роднае слова», байкі «Бот і лапаць», «Асёл і яго цень».

Пра партызанскую барацьбу ў Беларусі Закі Нуры расказаў у зборніку апавяданняў «І мёртвыя помсцілі». Двойчы татарскі паэт быў госцем Беларусі, калі ўдзельнічаў ва ўрачыстасцях, прысвечаных Янку Купалу, — да 80-, і 90-гадовага юбілеяў народнага песняра.

Зараз вершы Максіма Багдановіча — усяго дванаццаць твораў — пераклаў на татарскую мову народны паэт Татарстана Роберт Мінулін. І надрукавана гэтая падборка ў штотыднёвай газеце «Мадані жомга» за 9 снежня 2016 года. Роберт Мінулін — вядомы ў Татарстане паэт, перакладчык, дзіцячы пісьменнік. У 2009 годзе ён быў госцем Дня беларускага пісьменства ў Смаргоні. Удзельнічаў у «круглым стале» беларускіх і замежных пісьменнікаў, які традыцыйна праводзіцца ў Беларусі пачынаючы з 2007 года. У Мінску сёлета выйшла кніга Р. Мінуліна «Адна сям'я», адрасаваная юным чытачам. Перакладчык вершаў на беларускую мову — Яна Явіч.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Сямейная газета

Выпуск № 23 (66)

ТРЫ СІТЫ

Учора зайшла ў вагон метро — і не паверыла сваім вачам. Ён быў нязвыкла чысты: пустыя сцены, зусім без рэкламы.

«Да Новага года засталося ўсяго паўмесяца, — прамільгнула думка. — Трэба абавязкова паспець перабраць шматлікія паперкі, што назбіраліся за год на працы і дома, пазбавіцца ад непатрэбных рэчаў. І, вядома, схадзіць у лазню, каб увайсці ў 2017-ты абноўленай. Такая вось традыцыйная перадновагодняя чыстка. Яна (праверана) прыносіць палёгку. Праўда, зусім ненадоўга.

Справа ў тым, што, дбаючы пра вонкавую чысціню, мы, як правіла, забываемся пра галоўнае — чысціню думак, слоў, учынкаў. А потым здзіўляемся: «Куды ж падзелася наша жыццёвая энергія?»

Мудрацы нездарма звярталі ўвагу на розніцу паміж паняццямі «задача» і «праблема». Калі ў чалавека ўсё ў парадку з энергіяй, то праблемы, якія ўзнікаюць у яго жыцці, ён бачыць як задачы. Яны вырашальныя. І вырашаць іх цікава. Калі энергія чалавека вычарпана, то задачы, з якімі ён сутыкаецца, ператвараюцца для яго ў праблемы.

Дык як жа экстранна перад Новым годам аднавіць сваю жыццёвую энергію? Вельмі проста — перастаць траціць яе не на тое.

Што тычыцца мяне, то я вельмі востра адчуваю, як маю пазітыўную энергію паглынаюць негатыўныя эмоцыі. Таму нават гульню прыдумала: як толькі чую не вельмі прыемную навіну, адразу ж, замест таго каб расстроіцца, стараюся знайсці ў ёй пазітыў. Бо, як казала мама мумі-троляў Тувэ Янсан, нават самыя сумныя рэчы перастаюць быць самымі сумнымі, калі адносіцца да іх правільна.

Нядаўна пайшла абедаць. За суседнім столікам дзве жанчыны даволі гучна абгаворвалі трэцюю. І вось, здавалася б, разумею: нельга дрэнна думаць пра іншых. Але часам, асабліва калі ўсе вакол пачынаюць асуджаць кагосьці, па інерцыі таксама ўстаўляю свае пяць капеек. А потым адчуваю сябе знясіленай... Энергіі ні на што болей не хапае.

Найлепшае выйсце ў гэтай сітуацыі — адгарадзіцца ад чутак ды плётак. Як? Ну хоць бы па прыкладзе Сакрата.

— Ведаеш, што мне сказаў пра цябе твой сябар? — спытаў адзін чалавек у філосафа.

— Пачакай, — спыніў яго Сакрат, — прасей спачатку тое, што збіраешся сказаць, праз тры сіты.

— Тры сіты?

— Так, спачатку праз сіта праўды. Ты ўпэўнены, што гэта праўда?

— Не, я проста чуў гэта.

— Значыць, ты не ведаеш, праўда гэта ці не. Цяпер прасей праз другое сіта — сіта дабрыні. Ты хочаш сказаць пра майго сябра нешта добрае?

— Не, наадварот.

— Значыць, — працягваў Сакрат, — ты збіраешся сказаць пра яго штосьці дрэннае, але нават не ўпэўнены ў тым, што гэта праўда. Паспрабуем трэцяе сіта — сіта карысці. Ці так ужо неабходна мне пачуць тое, што ты хочаш расказаць?

— Не, у гэтым няма патрэбы.

— Такім чынам, у тым, што ты хочаш сказаць, няма ні праўды, ні дабрыні, ні карысці. Навошта тады казаць?

Дарэчы, пра словы. Заўважыла, што калі шмат жалюся на свой лёс, таксама адчуваю сябе знясіленай. Таму штодзень вучуся бачыць выключна пазітыўнае не толькі ў кожнай сітуацыі, але і любым чалавеку — нават у тым, які пакрыўдзіў. Мы з мужам нават прыдумалі маленькую традыцыю. Калі ў размове няма ні праўды, ні дабрыні, ні карысці, то хтосьці з нас, адчуваючы гэта, кажа: «А давай памаўчым разам».

Чысты вагон натхніў мяне і яшчэ на адну важную думку. А чаму мы робім чыстку раз на год? Навошта ўсе 12 месяцаў назапашваць непатрэбныя паперкі, рэчы ды негатыўную энергію, калі можна абнаўляцца штодзень? А яшчэ лепш — пільна сачыць за чысцінёй сваіх паліц, учынкаў, слоў... І, самае галоўнае, думак, з якіх усё пачынаецца. Бо сёння мы знаходзімся менавіта там, куды яны, учорашнія, нас прывялі...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

nadzieja@zviazda.by

■ Нясумнае развіццё

Бязмежныя «Калякі-Малякі»,

або Маляваць на сценах можна

Фота Надзеі БУЖАН.

Наталля НЯБОРСКАЯ разам са сваімі дочкамі-натхняльніцамі.

Некалі Наталля НЯБОРСКАЯ была звычайнай маці ў дэкрэтным адпачынку і, змірыўшыся («усё роўна рамонт»), назірала, як дачка Арына з асалодай размалёўвала сцены ў кватэры. Больш за тое, убачыўшы гэта самавыражэнне, яна зразумела, наколькі важна яно для дзіцяці. Дазволіць такую раскошу, як маляванне на сценах, можа сабе не кожны. «Павінна быць месца, дзе можна тое, што нельга», — вырашыла Наталля і стварыла студыю выяўленчага мастацтва. Назву «Калякі-Малякі» прыдумала яе юная мастачка.

МАЛЬДЗІВЫ... НА СТОЛІ

Яўгену — 4,5 года. Нядаўна хлопчык разам з бацькамі і маленькай сястрычкай лятаў на самалёце на Мальдзівы. Ён — пад вялікім уражаннем ад адпачынку. Сёння на занятку малюе восеньскія Мальдзівы. Вось востраў — маленькая аранжавая пляміна на паперы — такім ён бачыў яго праз акенца ілюмінатара. А вакол вада — сіняя, зялёная, блакітная — акіян, адным словам. Малюнак здаецца завершаны.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ У вас будзе дзіця

РАДАСЦЬ ДЛЯ РАДЫ

«Звязда» працягвае знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з хлопчыкамі і дзяўчынкамі, якія больш за ўсё на свеце мараць пра дружную сям'ю... Дзякуючы тэлевізійнай рубрыцы «У вас будзе дзіця» (што выходзіць на канале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома»), 68 герояў ужо знайшлі клапатлівых бацькоў. Вельмі хочацца верыць, што перад Новым годам і Рада пачуе радасную навіну.

Дзяўчынка з такім прыгожым і незвычайным імем пакуль жыве і выхоўваецца ў дзіцячым доме горада Віцебска. «Наша Рада — вясёлая, таварыская, добрая і спагадлівая, — расказвае **выхавальніца Ксенія МАРОЗАВА.** — Ёй вельмі не хапае цеплыні, таму мы часта абдымаемся. Дзяўчынка вельмі старанная, за поспехі ў вучобе пастаянна атрымлівае граматы». «Мае любімыя прадметы ў школе — літаратура, маляванне і матэматыка, — падхоплівае Рада. — Больш за ўсё люблю рашаць прыклады: множыць, дзяліць, складаць і адымаць лічбы...» «Над задачамі трэба доўга думаць, а Радзе, як і большасці непаседлівых, актыўных дзетак, хочацца зрабіць усё з першага разу», — усміхаецца выхавальніца. «Яшчэ мне вельмі падабаецца маляваць, асабліва жывёл, бо яны добрыя, мілыя. Я хачу гэта выразіць у сваіх карцінах. Таксама часта малюю замкі, бо яны бываюць розныя, люблю фантазіраваць. Я хачу стаць мастачкай». «Рада любіць рабіць усё ў кампаніі, таму часта просіць мяне памаляваць разам з ёй, — працягвае Ксенія Марозава. — У вольны час ахвотна ходзіць у спартыўную залу, каб пазаймацца з сяброўкамі фітнесам, парабіць розныя практыкаванні, пакачаць прэс. Многія нашы дзяўчынкі любяць танцаваць, і Рада не выключэнне. Ёй падабаецца ўключыць музыку і прыдумваць пад яе розныя рухі. Разам з іншымі дзяўчынкамі Рада ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах, якія праходзяць у нашым дзіцячым доме. Яна не толькі танцуе, але і чытае вершы, спявае, прычым робіць гэта вельмі артыстычна. Ёй усё вельмі лёгка даецца. Хочацца, каб для ўсіх дзетак, у тым ліку і для нашай Рады, як мага хутчэй знайшліся бацькі, якія будуць дарыць ім цеплыню, увагу і пяшчоту».

Калі вы хочаце даведацца пра Раду больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта

■ Сакрэты адной кватэры

«На месяц нам патрэбна 240 літраў малака»

ЯК ЖЫВЕ САМАЯ ВЯЛІКАЯ СЯМ'Я Ў ЕЎРОПЕ

Хасэ-Марыя ПАСТЫГА і Роза ПІК жывуць у Барселоне. Ён працуе бізнес-кансультантам, яна — маркетолагам на палову стаўкі. У іх — 18 (!) дзяцей. Старэйшаму — 23 гады, малодшаму — 7. «Калі з Бі-Бі-Сі званілі, каб дамовіцца зняць пра нас сюжэт, яны нават не верылі, што мы існуём», — смяюцца бацькі бадай самай вялікай сям'і ў Еўропе. Нядаўна Хасэ і Роза прыязджалі ў Беларусь, каб прэзентаваць кнігу «Як жыць шчасліва з 1, 2, 3... дзецьмі» (якая, дарэчы, цяпер перакладзена і на беларускую мову). Пра месячны бюджэт, дамашнія абавязкі і правілы выхавання вялікай сям'і нам удалося пачуць з першых вуснаў.

Сабраць усіх дзяцей на фота — складаная задача.

ЯК ЯНЫ ЎСЁ ПАСПЯВАЮЦЬ?

Хуткасць, з якой Роза спраўляецца з дамашнімі справамі, здзіўляе.

— У мяне рэкорд: за паўгадзіны магу зрабіць стрыжку пяцярым дзецям. Бачыце, усе хлопцы аднолькавыя. З дзяўчынкамі крыху складаней, — усміхаецца шматдзетная мама. — Калі мяне пытаюць, як я гатую, я адказваю, што ў Ikea прадаюць каструлі на восем літраў. Папраўдзе, мы не надта тлумім галовы гатаваннем. Я сказала б, што мы харчуемся «па-вайсковаму»: макарона, печаная курыца, рыс, яечня, бульба ў «мундзірах» (каб кожны сам абдзіраў шалупінне), сасіскі... Смажаную бульбу мы ніколі не робім, бо проста нерэальна прыгатаваць яе дастаткова на такую колькасць людзей.

Розе не прыходзіцца дзейнічаць у адзіночку. У пачатку года сямейства Пастыга-Пік збіраецца на дамашнім сходзе і дзеліць між сабою абавязкі. Выключаць святло ў кватэры, знімаць трубку, калі звоніць тэлефон, прыбіраць кухню, збіраць на стол, хадзіць у пякарню па хлеб...

— Дом належыць нам усім, а не толькі маме і тату, таму разам дбаем аб парадку, — тлумачаць сваю пазіцыю бацькі. — Нават у тры гады дзеці ўжо могуць засцілаць свой ложак.

У доме ўсе працуюць парамі: старэйшы клапоціцца пра малодшага. Калі малодшым патрэбна дапамога, яны не ідуць адразу шукаць бацькоў, а звяртаюцца да сваёй пары. І так заўжды, калі, напрыклад, згубіліся чаравікі, трэба рашыць складаную задачу па матэматыцы ці зрабіць прычоску.

«Ссабойку» ў школу кожны гатуе сабе сам. Робіць бутэрброды і кладзе ў партфель. Інакш застанецца галодным. Затое другі раз ужо не забудзецца.

ДАЦЯГНУЦЬ ДА КАНЦА МЕСЯЦА

Тысяча еўра. Столькі сям'я Пастыга-Пік траціць штомесяц на ежу. Яны набываюць 240 літраў малака, 1300 штук печыва, 100 яек, 300 боханаў хлеба, 25 кілаграмаў бульбы... Большасць прадуктаў купляюць раз у месяц праз інтэрнэт.

— Калі нешта заканчваецца, я не бягу адразу ж у краму, а чакаю наступнага месяца. Дзеці пра гэта ведаюць, таму яны самі не зацікаўлены з'ядаць прысмакі ў першы дзень, — кажа Роза.

Дарэчы, пра салодкае. Сокі і шакалад лічацца ў гэтай сям'і святочнымі прадуктамі.

— Мы вельмі экалагічная сям'я. Увечары збіраемся ў адным пакоі і там уключаем святло, — працягвае тэму эканоміі Хасэ. — Адзенне пераходзіць ад аднаго дзіцяці да другога. Цацак мы таксама не купляем: малыя гуляюць са сваімі братамі і сёстрамі.

— Калі дзеці просяць у мяне грошай, каб пайсці ў кіно ці кавярню, я кажу ім, што я не банк Іспаніі, а дома абед бясплатны. Хочаш грошай — працуй. Дзеці могуць быць нянькамі, рэпетытарамі, гатаваць і прадаваць печыва, трэніраваць футбольную каманду малодшых. Адзінаццацігадовы Пабла, напрыклад, кожны дзень атрымлівае адзін еўра ад сям'і, чый-го хлопчыка ён адводзіць у школу і забірае назад, — дзеліцца Роза.

Жанчына заўважае: многія памылкова лічаць, што дзіця — гэта цяжкая ноша, якая перашкаджае табе рабіць, што хочацца, і патрабуе вельмі вялікіх фінансавых укладанняў. Але як часта мы бачым у часопісах багатых і знакамітых людзей, у якіх толькі адзін сын ці дачка. Калі справа тычыцца колькасці дзяцей, праблема не ў адсутнасці грошай, а ў недахопе любові.

«МЕДЫКІ РАІЛІ НЕ НАРАДЖАЦЬ»

Хасэ і Роза марылі мець вялікую сям'ю, бо самі выраслі ў такіх. У мужчыны было 13 братоў і сясцёр, у жанчыны — 15. Але іх уласная гісторыя не была адразу шчаслівай. Першае дзіця нарадзілася з цяжкай кардыяпатыяй. Дактары папярэджвалі, што дзяўчынка не пражыве больш за тры гады, але, дзякуючы аперацыям і кардыястымулятару, яна дажыла да 22-х. Хаві, другое дзіця, памёр у паўтара года, таксама праз хваробу сэрца. Маленькай Мантсіты, якая была трэцяй, не стала, калі ёй было 10 дзён — яна нарадзілася без аорты.

— Менш чым за два месяцы мы пахавалі дваіх дзяцей, — успамінае Роза. — Медыкі раілі нам не нараджаць больш, бо дагэтуль усе дзеці з'яўляліся на свет хворымі, а значыць, і ў наступных будуць праблемы. Але здараецца, што навука памыляецца ў прагнозах, і мы вырашылі далей трымацца сваіх намераў мець вялікую сям'ю. Цяпер мы выхоўваем 15 дзяцей. Ніхто не мае права зазіраць у сямейны ложак. Рашэнне таты і мамы даць пачатак новаму жыццю — гэта рашэнне толькі гэтых дваіх.

ЗМЕНЫ ДА ЛЕПШАГА

У сям'і Пастыга-Пік дзеці ведаюць, што галоўная іх задача — вучыцца, і бацькі патрабуюць ад кожнага адпаведна яго магчымасцяў. У аднаго просяць дзявятак у дзённіку, а для іншага і шасцёркі — больш чым дастаткова. Роза і Хасэ імкнуцца раз у трыместр сустракацца з настаўнікамі ўсіх дзяцей. Але найперш размаўляюць з педагогамі не пра адзнакі, а пра паводзіны сына ці дачкі: ці клапоціцца пра аднакласніка, ці дзеліцца канспектамі?

Раз у паўгода сям'я складае спіс змен да лепшага, якія патрэбны кожнаму асабіста. Напрыклад, тата не павінен есці хлеба, бо не займаецца спортам і ад назапашвання вугляводаў у яго баліць пячонка. Удасканаленне для мамы — не камандаваць мужам. Дачцэ Кукі — яна яшчэ той шапаголік — трэба навучыцца хадзіць па крамах, але нічога не купляць. Пэпе — больш усміхацца, таму што яна занадта сур'ёзная, малому Тамасу — плакаць толькі адзін раз на дзень.

Дарэчы, тое, што Хасэ не займаецца спортам, у гэтым доме выключэнне. Усе хлопчыкі Пастыга-Пік запісаны на футбол, дзяўчынкі — на баскетбол. А Роза вяртае сабе спакой падчас гульні ў тэніс.

Як і ва ўсіх сем'ях, дзеці часам устройваюць істэрыкі. Але бацькі не паддаюцца на такія «канцэрты»: «Дзіцяці неабходны межы і правілы. Няхай яно крыкам выпрошвае нешта — трэба гаварыць яму «не». Мы не дазваляем хадзіць у кіно з сябрамі падчас экзаменаў, няхай хоць увесь клас збіраецца на прэм'еру фільма. Не купляем цукерак кожны дзень: не таму што не можам сабе гэта дазволіць, а таму што малыя становяцца капрызнымі і прыходзіцца часцей хадзіць да стаматолага. У рэальным жыцці мы не атрымліваем адразу ўсё, што захочам, трэба навучыцца чакаць і мець цярпенне».

САКРЭТ РОЗЫ

— Не разумею пазіцыі некаторых сваіх знаёмых жанчын, калі яны кажуць: «Я вельмі кахаю мужа, але сапраўдную любоў адчуваю да сваіх дзяцей». Мне здаецца, што не паставіць свайго мужа на першае месца — гэта памылка, — разважае Роза. — Тата і мама — самыя важныя людзі ў доме. Дзецям неабходна бачыць моцных бацькоў, якія больш за ўсё кахаюць адно аднаго.

У пачатку года сямейства Пастыга-Пік збіраецца на дамашнім сходзе і дзеліць між сабою абавязкі. Выключаць святло ў кватэры, знімаць трубку, калі звоніць тэлефон, прыбіраць кухню, накрываць на стол, хадзіць у пякарню па хлеб...

Жанчына прызнаецца: каб больш часу праводзіць побач з мужам, яна пачала чытаць. Раней ёй не хапала на гэта цярпення, ды і калі ў цябе 15 дзяцей, заўсёды знойдуцца іншыя заняткі. Але цяпер яны любяць разам з мужам сядзець у цішыні, кожны са сваёй кнігай. Хасэ чытае навуковыя даследаванні і працы па філасофіі, а Роза — бытавыя раманы пра каханне і раскошнае жыццё.

— Часам людзі ў мяне пытаюць, што за таблеткі я прымаю, — смяецца шматдзетная мама. — Яны кажуць: «Роза, я хачу тваю энергію, твой аптымізм». Ведаеце, у чым мой сакрэт? Кожны дзень прачынацца рана і хадзіць на святую імшу. Вось адкуль я бяру сілы, вось дзе бачу магчымыя рашэнні праблем, з якімі сутыкнуся сёння. Я па імёнах узгадваю ўсіх дзяцей, каб падумаць, над чым магу папрацаваць з кожным з іх, сустрэчы, што мусяць адбыцца, лісты, якія трэба адправіць. Кожны дзень у вялікім горадзе, дзе мы жывем, — гэта шаленства. Трэба адначасова іграць на стольких клавішах, што з самай раніцы вельмі карысна спыніцца і паразважаць, што і як зрабіць.

— А вашы дзеці? Яны не зайздросцяць «нармальным» сем'ям?

— Сябры дзяцей зайздросцяць нам! Калі ў нашых сыноў і дачок пытаюцца, ці хочуць яны самі стварыць вялікую сям'ю, яны адказваюць: «Так, бо гэта весела».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■

■ А што ў нас?

ПЯЦЬ ПРАВІЛАЎ БЕЛАРУСКАЙ ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І

Вялікія сем'і ёсць і ў нас. Муж і жонка ЯКІМАШКІ з вёскі Яромічы Кобрынскага раёна станавіліся бацькамі 14 разоў! Пра правілы, якія ёсць у іх сям'і, расказала мама Галіна.

Мы не набываем дарагіх рэчаў. Навошта купляць дарагую мэблю, якую ты са сваім невялікім заробкам не можаш сабе дазволіць, калі ёсць больш танная і такая ж зручная? Улазіць у крэдыты, а потым перажываць, што няма чым заплаціць? Людзі імкнуцца мець усё самае шыкоўнае. Але гэта лішняе. Можна ўзяць не імпартную патэльню за 150 рублёў, а беларускую — за 50. А на астатнія грошы лепш купіць дзіцяці новае адзенне.

Час да абеду — для малодшых, пасля — для старэйшых. Адразу ўсіх не ахопіш увагай. Таму зранку, пакуль старэйшыя дзеці ў школе, я праводжу час з малодшымі. Адказваю на іх пытанні, суцяшаю. У абед у іх па раскладзе сон. Да гэтай пары ўжо вяртаюцца з заняткаў старэйшыя, і я магу выслухаць іх і дапамагчы. Размаўляем таксама ўвечары за сталом, за работай па доме.

Тэлевізар дзеці глядзяць рэдка. Мы вучым, што гэта не вельмі карысна. Дый часу, каб сядзець перад тэлевізарам, у малых асабліва няма. Школьныя заданні, дамашнія справы... Яшчэ ў нас створаны сямейны музычны ансамбль. Камп'ютарам дзеці карыстаюцца па патрэбе. А мабільнік ёсць толькі ў дачкі, якая вучыцца ў 10 класе, — адзін на шэсць школьнікаў (зразумела, дзеці, якія ўжо выраслі і самі зарабляюць, маюць тэлефоны).

Я не хаджу на работу. Не разумею, як можна паспяваць працаваць і спраўляцца з усімі дамашнімі справамі, калі ў цябе больш за 10 дзяцей. Раней мамы, якія выхоўваюць пяцярых, маглі выходзіць на пенсію ў 50 гадоў. Цяпер для гэтага патрэбны страхавы стаж мінімум пяць гадоў. Як яго набраць — для мяне задача. Я 24 гады ў адпачынку па доглядзе дзіцяці. Каб выйсці працаваць на паўстаўкі, трэба наймаць няньку. Але дзе на гэта знайсці грошы? І нянька не заменіць маці.

Мы не дзелім абавязкі на жаночыя і мужчынскія. Тата ў нашай сям'і — здабытчык, але пасля работы ён не ляжыць на канапе. Дапамагае з дамашнімі справамі: абслугоўвае веласіпеды, нешта рамантуе, улетку апрацоўвае ў агародзе памідоры і капусту. Займаецца з дзецьмі музыкай: навучыў хлопчыкаў іграць на гітары і кіруе нашым сямейным ансамблем. А ў выхадныя, калі я вельмі занятая, можа і з прыгатаваннем абеду дапамагчы.

Генадзь і Галіна ЯКІМАШКІ ў акружэнні сваіх дачок і сыноў. Старэйшыя ўжо жывуць асобна ад бацькоў.

■ Не з пустымі рукамі

«Каб падарунку быў я рады, у бацькоў спытай парады!»

ШТО НЕЛЬГА ДАРЫЦЬ ДЗЕЦЯМ?

Падарункі — гэта заўсёды прыемна. І дзеці іх з нецярпеннем чакаюць, таму трэба, каб чаканне апраўдалася — прэзент спадабаўся. Але не менш важна, каб падараным рэчам былі рады і бацькі, бо малыя яшчэ дакладна не ведаюць, што сапраўды будзе для іх карысна, а што — небяспечна.

Калі нарадзіўся Даня, да нас па чарзе пачалі прыходзіць сваякі, каб наведаць немаўля. Зразумела, усе прыносілі падарункі. Што тут пачалося! Паўзункі, бодзі, распашонкі, гарнітурчыкі, піжамкі, шапачкі, калготкі, камбінезон з курткай на зіму і яшчэ міжсезонны — усё ў такой колькасці, што аднаму не знасіць. Здаецца, можна было б узрадавацца, бо нічога купляць не прыйдзецца. Але, па-першае, адны рэчы былі «на выраст», і калі прыйшоў час іх насіць, яны не падышлі па сезоне. Іншыя аказаліся з сінтэтычнага матэрыялу, што не вельмі добра для малога. Трэція былі непрыгожымі, на мой густ, і нават не хацелася іх апранаць. Па-другое, як мне здаецца, любой маці, тым больш калі нараджаецца першынец, хочацца самой выбіраць дзіцячае адзенне.

Акрамя адзення, пасля гасцей засталася яшчэ цэлая скрынка разнастайных бразготак, мяккіх мядзведзікаў і зайчыкаў.

Напэўна, у адпаведнай сітуацыі былі многія бацькі. І здаецца, першы раз можна на гэта не звяртаць увагі. Але калі на кожнае свята ваша дзіця будзе атрымліваць шмат непатрэбных рэчаў, то гэта пачне раздражняць. Таму тым, хто чарговы раз збіраецца ашчаслівіць дзіця падарункам, лепш дакладна ведаць, што дарыць **нельга**. Запамінайце:

1. Кітайскі «шырспажыў». Звычайна гэта танныя, ломкія цацкі са з'едлівым пахам пластмасы. У нашага сына яны звычайна не «пражываюць» і гадзіны, але іх часта купляюць, каб нешта даць малому ў ручкі. У такім выпадку лепш прынесці дзіцяці вязанку надзіманых шароў. Малы будзе ў захапленні.

2. Канструктар з дробнымі дэталямі. Некаторым бацькам не падабаюцца такія цацкі, бо дзеці раскідваюць іх паўсюль, і ўсе раз-пораз на іх натыкаюцца. Аднак у абарону «дробнага» канструктара трэба сказаць, што ён добра развівае маторыку, фантазію, мысленне. Таму карысці ад яго ўсё ж больш. Выйсце ёсць! Напрыклад, я прывучыла сына гуляць з маленькімі дэталямі ў адным месцы, а не насіць па ўсім доме. Да таго ж канструктар мы захоўваем у скрынцы з невялікімі борцікамі. Малому зручна гуляць у ёй (не трэба высыпаць на падлогу ўвесь канструктар), і дэталі не раскідваюцца.

3. Занадта шумныя цацкі. Дзеці іх любяць, а дарослыя хутка стамляюцца ад павышанага ўзроўню шуму. Нам аднойчы падарылі матацыкл, які роў амаль як сапраўдны. Каб уключыць, трэба было выняць спецыяльную пласцінку, а каб выключыць — уставіць назад. Так сталася, што пласцінка згубілася, і мы нічога не маглі зрабіць, каб гэты «байк» замаўчаў. Потым уставілі палоску кардону так далёка, каб выняць яе ўжо было немагчыма.

Усе танкі, аўтаматы, якія мільгацяць або выдаюць рэзкія гукі, — занадта агрэсіўныя для дзіцячай псіхікі. А зусім малых могуць напалохаць. Напрыклад, наш Даня, калі яму быў годзік, расплакаўся, пачуўшы, як прыгожы руковы мядзведзік заспяваў вясёлую дзіцячую песню.

4. Забаўкі не па ўзросце. Асабліва сумна, калі гэта яшчэ і добрыя, якасныя цацкі. Хросны бацька нашага сына на два гады падарыў яму машыну з пультам кіравання. Зразумела, што ў гэтым узросце малы не разумеў, як ёю кіраваць, і наўгад ціснуў на рычаг. Ад падарунка не толькі не было карысці, але і псаваліся вуглы мэблі, калі машына ўразалася ў іх на вялікай хуткасці. Выйсце было адно: схаваць забаву да лепшых часоў, што я і зрабіла.

Недарэмна на цацках указаны ўзрост дзіцяці. Арыентуйцеся на гэта пры выбары рэчаў. І тады малы сапраўды атрымае максімум карысці.

5. Адзенне. Няякаснае, вельмі яркіх колераў, з сінтэтычных матэрыялаў — нікому не даспадобы. Лепш не рызыкуйце, бо можаце не ўгадаць з памерам, і кофтачка акажацца маленькай. Занадта навырост таксама нельга купляць, вопратку — бацькі пакладуць на паліцу і могуць пра яе забыць. Да таго ж, мама часта падбірае адзенне па стылі, колеры, а вы не ведаеце яе густ.

Калі на кожнае свята, хай то дзень нараджэння ці Новы год, ваша дзіця будзе атрымлівасць вялікую колькасць непатрэбных рэчаў, то гэта пачне раздражняць.

Бабуля падарыла Даню сінюю піжаму ў выглядзе касцюма «чалавека-павука», да таго ж яна была пухнатая і поўнасцю з акрылу. Рэч доўгі час праляжала ў шафе. Сёння Даня часам просіць надзець яе, калі мы ў вёсцы распальваем вогнішча або ходзім у лес.

6. Прэзенты, да якіх трэба дадаткова нешта купляць. Напрыклад, аўтадром «Шчанячы патруль» не будзе радаваць малога, пакуль бацькі не купяць усіх герояў з адпаведнага мульціка. А каштуюць яны дорага.

На 3 гады Даню падарылі паравоз. Ён выглядаў, як паменшаная копія сапраўднага, ездзіў па вялікай чыгунцы, пыхкаў, а з трубы ішла пара. Сын, зразумела, быў вельмі ўражаны. Але батарэек хапіла ўсяго на адзін вечар, а каштавалі яны зусім не танна (патрэбны былі спецыяльныя, вялікіх памераў). Карацей, цацка аказалася дарагой.

7. Небяспечныя шабля, меч, нож, пісталет таксама выклікаюць крытыку бацькоў. Гуляючы з імі, дзеці могуць параніцца або сапсаваць нешта. А гэта можа пакінуць негатыўныя ўражанні ад падарунка.

8. Мяккая цацка вялікіх памераў. Сучасных дзяцей гэтыя «грамілы» ўвогуле мала цікавяць, да таго ж двухметровы заяц зойме занадта шмат месца ў кватэры, а з гадамі ператворыцца ў вялікі пылазборнік. Дарэмная трата грошай.

9. Салодкі падарунак. Калі малы бачыць вялікую колькасць цукерак у прыгожых абгортках, для яго гэта значыць толькі адно — ён можа іх з'есці. Калі не за раз, то за два.

Самае бяспечнае, чым усё можа скончыцца, — дыятэз. Да таго ж мама, зразумела, паспрабуе адабраць гэтую спакусу, і малы ўзніме крык — настрой будзе сапсаваны. Каб пазбегнуць такой сітуацыі, запомніце агульнае правіла: усё, што можна з'есці, трэба аддаць не дзіцяці, а бацькам, бо яны лепш ведаюць, што можна малому, а што — не, і калі лепш даць яму паласавацца. Зразумела, аддаваць прысмакі трэба не пры дзіцяці.

10. Грошы. Дарыць іх могуць хіба што бацькі або бабулі-дзядулі. Многія дарослыя ўвогуле супраць, каб у дзяцей былі грошы, бо тыя не змогуць імі правільна распарадзіцца. Калі грошы вы аддасце бацькам (маўляй, няхай купяць, што трэба), то дзіця адчуе, што ўвогуле не атрымала ніякага падарунка. У такім разе трэба нечым парадаваць і малога — уручыце яму цікавую кніжку з добрымі ілюстрацыямі.

І нарэшце, калі вы хочаце, каб падарунак сапраўды спадабаўся, лепш парайцеся з бацькамі. Яны падкажуць, аб чым дзіця марыць, чым захапляецца, ад чаго будзе пад вялікім уражаннем.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ

■

■ Творчы эксперымент

НОВЫ ГОД — НААДВАРОТ,

або Як незвычайна сустрэць свята?

Новы год у кожнага з нас атаясамліваецца з вялікай колькасцю традыцый: упрыгожыць ёлку і кватэру, падрыхтаваць прыемныя падарункі і паштоўкі, накрыць стол з любімымі стравамі, выпіць пеністага шампанскага, загадаць жаданне пад бой курантаў... Нягледзячы на тое, што ўсё, здаецца, звыкла і прадказальна, многія людзі ў глыбіні душы па-ранейшаму вераць у маленькае дзіва і спадзяюцца, што навагодняя ноч будзе незвычайнай, поўнай сюрпрызаў. Калі і вы з іх ліку, прапаную крышачку адысці ад агульнапрынятых рытуалаў і паглядзець, што з гэтага атрымаецца. Давайце адзначым Новы год — наадварот, бо правілы існуюць, каб іх парушаць!

✓ Вы заўсёды лічылі, што Новы год — сямейнае свята і прывыклі да хатніх пасядзелак? Адпраўляйцеся ў госці, закажыце стол у кафэ або рэстаране, калі ёсць хатка ў вёсцы — спраўляйце свята там. А можна ўвогуле радыкальна падысці да пытання: адправіцца ў навагодні тур па Еўропе або на гарналыжны курорт. Хочацца экзотыкі — забраніруйце нумар у гістарычным месцы: Мірскім або Нясвіжскім замку, рэзідэнцыі Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы — там вас чакае чароўная атмасфера.

У Румыніі абавязковай стравай лічыцца пірог, у якім «схаваны» манета, арэх або пярчынка. Знаходка абяцае ўладальніку ў будучым годзе стварыць сям'ю.

Калі, наадварот, звычайна на Новы год вы пакідалі родны дом, то прыйшоў час зладзіць хатнюю вечарынку і паклікаць гасцей да сябе.

✓ У вашым доме прынята ставіць жывую лясную прыгажуню? На гэты раз зрабіце ялінку сваімі рукамі ў выглядзе конуса і ўпрыгожце самаробнымі цацкамі, шышкамі, цукеркамі. Можаце стварыць сілуэт ёлкі на сцяне і прымацаваць да яго шаўковыя банцікі, рознакаляровыя зорачкі і бялюткія сняжынкі.

✓ Адмоўцеся ад усіх традыцыйных салатаў і гарачых закусак. Самы час пакаштаваць нешта новае і арыгінальнае. Скарыстайцеся рэцэптамі страў іншых краін свету. Напрыклад, у Англіі традыцыйна на святочны стол ставяць індычку, фаршыраваную гароднінай. А ў Румыніі абавязковай стравай лічыцца пірог, у якім «схаваны» манета, арэх або пярчынка. Знаходка абяцае ўладальніку ў будучым годзе стварыць сям'ю. Навучыцеся гатаваць тое, што даўно планавалі. Замест традыцыйнага шампанскага зрабіце свае кактэйлі.

✓ Дзед Мароз і Снягурка заўсёды радуюць сваім з'яўленнем. Толькі на гэты раз запрасіце да сябе Снежную Каралеву і Снегавіка (можна каму-небудзь пераапрануцца). Гэтыя казачныя героі абавязкова спадабаюцца гасцям.

✓ Звычайна навагоднюю праграму рыхтуюць дарослыя для дзяцей. А можа, прыйшоў час зладзіць ранішнік для дарослых? Папрасіце дзяцей (калі яны не зусім маленькія, вядома) падрыхтаваць забавы для мамы, таты, бабулі і дзядулі, а тыя няхай безадказна выконваюць усе самыя дзівацкія задумкі. Прапануйце пагуляць у «кракадзіла». Загадзя прыдумайце цікавыя словазлучэнні, напрыклад «ёлка, якая загарэлася», «надакучлівыя госці», «стомленая Снягурка». І не забудзьцеся пра маскарадныя касцюмы. Напэўна, такая забава прыйдзецца ўсім па душы.

✓ Як правіла, у навагоднюю ноч не сціхаюць залпы салютаў і петард. Адыдзіце ад правіла і запусціце ў неба паветраныя шары або нябесныя ліхтарыкі.

✓ Што ўсе робяць без пяці хвілін да 12? Правільна, слухаюць віншаванне Прэзідэнта. А вы запішыце ўласнае віншаванне для сям'і і сяброў і ўключыце ў патрэбны момант. Вось будзе нечаканасць!

✓ Самы прыемны момант для дзяцей, вядома, раскрываць падарункі. Цікавая ідэя — прапанаваць малым гульню-квэст. Схавайце падарункі недзе ў кватэры і зрабіце карту з загадкамі. Няхай пошук «навагодняга скарбу» стане сапраўднай прыгодай.

Наталля ЛЕАНОВІЧ

■

Бязмежныя «Калякі-Малякі»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Але Яўген задуменна пазірае на тое, што атрымалася. Апошні штрых. Хлопчык бярэ вялікі пэндзаль, шчодра абмаквае ў ружова-чырвоны колер і з усяго размаху пырскае на «восеньскія Мальдзівы». У момант на паперы з'яўляецца сотня маленькіх кропачак. Не менш іх — на падлозе, сценах і нават на столі. Яўген з задавальненнем пазірае на сваю работу...

Калі заходзіш у «Калякі-Малякі», не застаецца сумнення, што гэта дзіцячая студыя малявання. Рознакаляровы россып фарбаў упэўнена пасяліўся паўсюдна — маленькія ручкі пастараліся. І калі напачатку такое самавыяўленне крышачку палохае, то назіраючы, з якой асалодай малыя пэцкаюцца (бо ведаюць, што за гэта нічога не будзе), у мяне, як у маці, пачала закрадвацца шалёная думка: «А можа, і мне так дома з сынам паспрабаваць?»

— На жаль, ёсць дзеці, якім бацькі ўвогуле ніколі не давалі ў рукі фарбы, бо перажываюць, што яны ўсё запэцкаюць, — расказвае Наталля. — Абмяжоўваць такім чынам малечу — небяспечна для яе развіцця. Таму мая студыя павінна стаць тым месцам, дзе можна ўсё! Мы малюем незвычайнымі спосабамі, з дапамогай клею, солі, раслін, не стрымліваем творчыя парывы. Мае дзеці тут таксама «адрываюцца».

Зняць празмернае напружанне ў дзіцяці, навучыць яго самарэалізоўвацца і самасцвярджацца з дапамогай творчасці — Наталля Няборская лічыць галоўнай мэтай сваёй студыі. І, вядома, асабістай, бо штодзённа праводзіць заняткі па ўласна распрацаванай праграме.

— Мне важна, каб дзеці навучыліся думаць самастойна. Не баяліся прымаць рашэнні, адкрыта выказваць свае меркаванні. У паўсядзённым жыцці так шмат абмежаванняў: у дзіцячым садку, потым у школе ўсіх вучаць прытрымлівацца пэўнай лініі, рабіць па прыкладзе. Гэта таксама трэба, але дзіця павінна ведаць і іншы бок — мець свабоду, разняволена сябе паводзіць.

КАБ АДПАЧЫНАК СТАЎ ЦІКАВЫМ

Спачатку студыя не задумвалася як бізнес, а была і для самой Наталлі самарэалізацыяй.

Усё склалася само сабой. Нечаканая цяжарнасць у 18 гадоў. Але кідаць вучобу ў Расійскім дзяржаўным сацыяльным універсітэце па спецыяльнасці «Сацыяльная работа» Наталля не стала. Вырашыла: «Спраўлюся!» Выкладчыкі пайшлі насустрач, а муж, калі трэба было, заставаўся з малой. І ўсё ж такі дэкрэт аказаўся сумнай справай. Маладой мамачцы катастрафічна не хапала зносін.

Тады Наталля хуценька пазнаёмілася з такімі ж мамачкамі і запрасіла іх да сябе ў госці.

— Усё атрымалася ўдала, — успамінае яна. — Маленькія дзеткі ляжаць на дыване і гуляюць, а мы з мамамі п'ём гарбату. Калі нашы дочкі-сыночкі падраслі, мы пачалі праводзіць з імі заняткі для развіцця. Адны мамы паведамілі пра гэта іншым мамам, і да мяне пачалі прыходзіць новыя жанчыны, якія таксама шукалі нешта цікавае для малых.

— Вядома, у дэкрэце твой лад жыцця мяняецца кардынальна. Для некаторых гэта становіцца выпрабаваннем на трываласць. У мяне пасля родаў не было дэпрэсіі. Лічу, што яна — ад гультайства, нерэалізаванасці. Нельга сядзець на месцы і шкадаваць саму сябе, а трэба зрабіць першы крок, каб нешта змяніць. Пашукайце аднадумцаў. Я ўпэўнена, што ў кожнай жанчыны ёсць скрытыя таленты. Пачынайце рабіць тое, што вам падабаецца. Кажуць: не хапае часу. Не веру. Адна рука занятая, але другая ж свабодная. Навучыся карыстацца слінгам — і ў цябе стане дзве рукі!

«На жаль, ёсць дзеці, якім бацькі ўвогуле ніколі не давалі ў рукі фарбы, бо перажываюць, што яны ўсё запэцкаюць. Абмяжоўваць такім чынам малечу — небяспечна для яе развіцця».

З цягам часу Наталля пераканалалася, што лепшы кірунак для развіцця дзіцяці — гэта мастацтва. Да таго ж у яе за плячыма была мастацкая школа і вялікая цяга да жывапісу і арт-тэрапіі.

— Калі я вырашыла заняцца мастацтвам, я зацяжарала ў другі раз, — іранізуе Наталля. — Але «механізм» ужо быў запушчаны, і спыніцца я не магла. Таму, калі Дашы (малодшай дачцэ) было ўсяго тры месяцы, я ўжо дома займалася з дзецьмі жывапісам. Адных рыхтавала да паступлення ў мастацкую школу, іншых — у Каледж мастацтваў...

ПРАЕКТ ДУШЫ

Наталлі па-ранейшаму не сядзелася на месцы, і яна пачала праводзіць пленэры, запрашаючы ўсіх ахвотных праз сацыяльныя сеткі. Бацькі і дзеці актыўна прымалі ўдзел і з задавальненнем малявалі на адкрытым паветры. Не менш ахвотнікаў прыходзіла і на бясплатныя майстар-класы па нетрадыцыйных тэхніках жывапісу, якія адбываліся ў антыкафэ «Дом Фішара».

Фота Надзеі БУЖАН.

— Натуральна, нам спатрэбілася ўласнае месца для такіх заняткаў, бо ў чужым прэзентабельным памяшканні асабліва не разгонішся, дзеці незнарок могуць запэцкаць крэсла, узяўшыся за яго брудnымі рукамі.

Аднойчы настаўніца старэйшай дачкі папрасіла Наталлю правесці майстар-клас у школе. Дзецям вельмі спадабалася маляваць пры дапамозе пены для галення. І хутка на базе школы адкрыўся першы філіял студыі «Калякі-Малякі». Займаліся там вучні 1—2 класаў. Зразумела, што школа таксама не стала тым месцам, дзе дзецям дазвалялася б самыя смелыя эксперыменты з фарбамі, але за год Наталля змагла назбіраць грошай, каб адкрыць уласнае памяшканне, дзе можна будзе «бязмежна весяліцца».

Памяшканне знайшлося само сабою. Наталлі патэлефанавала жанчына і папрасіла пазаймацца з яе дачкой, у якой сіндром Даўна. Атрымаўшы згоду, маці дзяўчынкі паведаміла, што ў іх доме якраз здаецца памяшканне. Так Наталля адкрыла першую студыю «Калякі-Малякі». Але напярэдзе было самае цяжкае — знайсці маленькіх наведвальнікаў.

— Калі прапануеш людзям нешта новае, — тлумачыць Наталля, — то патрэбны пэўны час, пакуль яны разбяруцца і пераканаюцца, што гэта карысна, цікава. Да таго ж многія бацькі ўжо пасля першага занятку чакаюць малюнак, як у сапраўднага мастака, а калі яго не атрымліваюць — расчароўваюцца.

На справе ж першыя паўгода дзіця толькі вучыцца працаваць з пэндзлямі, губкай, валікам; змешваць колеры і атрымліваць новыя. Для яго гэта сапраўдны цуд. А яшчэ ў многіх малых абавязкова існуе перыяд адаптацыі. Напрыклад, Соня некалькі месяцаў запар толькі і рабіла, што стварала сабе фарбамі на руках пальчаткі. І мама ўжо нават страціла надзею, як раптам дзяўчынка намаляваала рэпрадукцыю Ван Гога.

Гэта быў цяжкі час для Наталлі. Групы цалкам не набіраліся, заняткі часта зрываліся. Нават хацелася ўсё кінуць, бо не раз даводзілася плаціць з уласнай кішэні. Але раптам убачыла, што здаецца ў арэнду добрае памяшканне недалёка ад дома. І з'явілася надзея, што менавіта вось тут, у новым мікрараёне, дзе шмат маладых сем'яў з дзецьмі, усё атрымаецца. Так і здарылася.

Студыю «Калякі-Малякі» Наталля Няборская называе «праектам душы». Можа, таму ў яе галаве і няма канкрэтнага плана развіцця. Усё адбываецца выпадкова, але па загадзе сэрца. А вось мэты дакладна ёсць. Хочацца зладзіць выставу дзіцячых работ у Гістарычным музеі. Набраць дзве групы дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці і знайсці фінансаванне, каб яны займаліся ў студыі бясплатна. Ды і шмат яшчэ чаго...

Парады бацькам ад Наталлі Няборскай

З якога ўзросту ў рукі дзіцяці можна даваць фарбы?

З той хвіліны, як яно пачало пераварочвацца і махаць рукамі... Хай размазвае па старых шпалерах, разасланых на падлозе. Але нават пальчыкавыя фарбы не такія бяспечныя, як пра іх пішуць. Зрабіце самі — з вады, крухмалу і дадайце натуральнага фарбавальніка, напрыклад бурачнага соку.

Чым лепш маляваць: алоўкамі, фарбамі, фламастарамі?

У залежнасці ад таго, якія ў вас мэты. Аловак падрыхтоўвае руку да пісьма, паляпшае каардынацыю, дапамагае сканцэнтравацца. Дарэчы, бацькі абавязкова дамагаюцца, каб дзіця правільна ўзяло яго ў рукі. Гэта рабіць нельга. З цягам часу малы сам зразумее, што правільна трымаць аловак зручней. Пачынаць карыстацца ім лепш перад школай. Фламастары я б не раіла, але яны падабаюцца дзецям, таму што яркія. Гуаш для дзяцей — добры матэрыял, яна таксама яркая, мякка кладзецца, не выцвітае.

Ці добра маляваць рукамі?

Так, асабліва самым маленькім. Але некаторыя дзеці баяцца запэцкаць рукі. Напрыклад, у 6 гадоў, калі малы ніколі раней не маляваў рукамі, ён не захоча спрабаваць гэта рабіць.

Хачу параіць часта мяняць інструмент малым дзецям, бо яны хутка стамляюцца ад аднастайнасці. Памаляваў трохі пэндзлем — на́ табе валік, потым паспрабуй відэльцам пакрэмзаць.

Ці трэба хваляваццa, калі дзіця малюе цёмнымі колерамі: чорным, сінім?

Не. Дзеці выбіраюць яркія колеры, а цёмныя ў палітры — сапраўды самыя яркія. Да таго ж малюнкі іншы раз выглядаюць змрочнымі, таму што дзеці змешваюць фарбы, і ў выніку атрымліваецца нешта чорнае і незразумелае. Часта бацькі не бачаць усяго працэсу малявання, а толькі канчатковы вынік, таму і палохаюцца. А дзеці думаюць, што калі возьмуць адразу многа колераў і змяшаюць, то ў іх атрымаецца вясёлка.

Ці варта хваліць кожны малюнак дзіцяці? Можа, трэба ўсё ж сказаць, што нешта не атрымалася?

У кожным малюнку можна знайсці ўдалы момант, нават калі ў цэлым карціна не атрымалася, як вам падаецца. Нельга фіксаваць увагу на няўдачы, бо гэта абавязкова запомніцца. Няхай лепш гэта будзе добры штрых.

Нельга таксама параўноўваць малюнкі дзіцяці з малюнкамі іншых і крытыкаваць. Лепш параўнайце яго работу з папярэднімі. Пераканана — будзе за што пахваліць.

Дзеці часта просяць ім намаляваць...

Рабіць гэта не варта. Бо малы возьме ваш малюнак за эталон, а сам так не намалюе. Такім чынам можа з'явіцца комплекс непаўнавартаснасці. І потым дзіця кажа: «Я не ўмею і не буду гэта рабіць». Пераканайце яго, што ён усё умее, толькі не спрабаваў яшчэ.

Што рабіць, калі дзеці малююць на шпалерах?

Арганізуйце для малога спецыяльнае месца і будзьце побач. Стварыце ўмовы. Можна прыбраць дыван і заслаць падлогу цыратай.

Ці карысныя размалёўкі?

Размалёўкі рана ці позна ўсё роўна трапяць да вашага дзіцяці. Але галоўнае, каб мама не ставілася крытычна да таго, што малы выходзіць за лінію. Інакш у далейшым вы рызыкуеце сфарміраваць пачуццё страху ў дзіцяці перад выхадам за нейкія межы падчас прыняцця рашэнняў. А гэта небяспечна. Такім чынам, калі размалёўкі — то ў адвольнай форме.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.

■ Догляд за сабой

НАЙЛЕПШЫ МАКІЯЖ — ТОЙ, ЯКІ НІХТО НЕ БАЧЫЦЬ

Універсальныя парады ад візажыста

Да таго, якім чынам фарбуешся, хутка прызвычаіцца. Штодзень адно і тое ж. Аднак ад такога роўнага стаўлення часта церпіць якасць нашага знешняга выгляду. Незалежна ад гэтага спрацоўвае правіла самаздзяйсняльнага прароцтва: усё адно «пазнаюць нашу дачку і ў андарачку»... Мы перастаём заўважаць відавочныя недарэчнасці, якія прафесіянал выправіў бы ў адно імгненне. Мы звярнуліся да візажыста Настассі ФЁДАРАВАЙ, прыхільніцы максімальна натуральнага макіяжу, якая прапанавала чытачкам «Сямейнай газеты» ўніверсальныя парады, як лепей фарбавацца штодзень.

Настасся мульціблэндарам растушоўвае танальны крэм.

Этап 1.

Догляд і ўвільгатненне

Самая частая памылка — калі жанчына прапускае ці этап догляду за скурай, ці дэкаратыўную касметыку. Звычайна ёсць час толькі на штосьці адно: ці нанесці крэм, ці наадварот — раніцай прачнуцца, памыцца і адразу ж пачаць фарбавацца. У ідэале ўсё павінна быць паслядоўна. Спачатку — догляд, затым дэкаратыўная касметыка. Каб яна добра «ляжала», самы важны сакрэт — гэта ўвільготненая скура твару, вакол вачэй і вуснаў. Таму спачатку ачышчаем скуру гелем ці пенкай, затым карыстаемся тонікам і толькі пасля таго — крэмам. Асобна крэм для вачэй, асобна — для скуры. Лепш за ўсё з SPF (сонцаахоўны фільтр), каб скура не старэла, нават калі пра гэта пакуль не думаецца. Або фільтр можа прысутнічаць у танальным крэме.

Да макіяжу і пасля яго.

Такім чынам варта маляваць стрэлкі на вачах.

Асобная парада — выкарыстоўваць для твару лёд касметалагічны, адвары траў ці ваду (апошняе — самы лепшы варыянт). «Я сама так раблю не штодзень, але праз дзень — дакладна. Гэта дапамагае прачнуцца лепш, чым кава», — дзеліцца Настасся. Менш бюджэтны варыянт лайфхака — патчы для вачэй. Гэта сіліконавыя падушачкі, якія кладуцца пад вочы і пазбаўляюць ад сінякоў, але ненадоўга — палову дня ці на цэлы. Патчы можна захоўваць у халадзільніку, раніцай дастаць, прыклеіць і хадзіць з імі 20—30 хвілін. Нават у машыне! Лепш набываць карэйскія, у іх аптымальнае спалучэнне кошту і якасці.

Этап 2.

Падсвятленне

Пачынаем з бліскучай тэкстуры, але без блёстак — хайлайтара. Ён бывае сухі, вадкі і крэмавы. Яго галоўная задача — падсвятляць скуру, каб яна выглядала больш свежай, здаровай і маладой. Зоны для яго нанясення стандартныя: верхняя частка броўнай дугі, верхняя частка скулаў, над верхняй губой, унутраны вугалок вока. Калі дзяўчына збіраецца на вечар, то асобна прамалёўваюцца ключыцы.

Асобная парада — выкарыстоўваць для твару лёд касметалагічны, адвары траў ці ваду (апошняе — самы лепшы варыянт).

Пры нанясенні (гэта тычыцца ўсіх этапаў незалежна ад таго, што наносім) старацца не расцягваць скуру. Для гэтага Настасся раіць раздрукаваць схему масажных ліній скуры твару і шыі, павесіць яе каля люстэрка і карыстацца ўсімі касметычнымі сродкамі выключна па ёй. Акрамя таго, пасля ўмывання нельга расціраць скуру ручніком, можна толькі прамакаць.

Этап 3.

Танальныя сродкі

На гэтым этапе самая частая памылка — няправільна падабраны колер: калі ён адрозніваецца на твары і на шыі. Часта дзяўчаты маюць праблемную скуру, і набываюць самы густы тон для таго, каб схаваць недахопы. Лепш жа маскіраваць іх кропкава, глядзіцца гэта больш натуральна. Калі праблемы надта заўважныя, то варта звярнуцца да дэрматолага. Таксама ні ў якім разе нельга карыстацца спонжам, не памыўшы яго. Бо ён становіцца аб'ектам для назапашвання мікробаў, якія пасля перанясуцца на скуру. Спонж можна захоўваць 2—3 месяцы, і то пры ўмове, што ён пастаянна мыецца ці апрацоўваецца спецыяльнымі дэзынфіцыруючымі сродкамі для касметыкі.

Колер падбіраецца па шыі (ключыцы). Яна звычайна больш светлая за твар. Калі пасля растушоўкі тон непрыкметны — колер падабраны трапна. «Я часта раю сэканоміць на пэўных касметычных сродках, але не танальных. Няхай гэта будзе люксавая касметыка, а не набытая ў масмаркеце. З бюджэтных добры SS-крэм ад Lumene ці яго аналаг у карэйскай касметыцы (падыдзе і BB-крэм). З люксавай касметыкі раю тон ад Armani.

Яшчэ адна памылка — выкарыстоўваць базу пад макіяж. Вядома, нічога адмоўнага ў ёй няма, але накладваць яе кожны дзень не варта. Яна больш падыходзіць для прафесійнага выкарыстання: калі дзяўчына збіраецца на сцэну, альбо ў яе штодзённа вельмі адказная праца, на якой трэба бездакорна выглядаць. Гэта лішні слой у макіяжы, з-за якога скура не дыхае, асабліва — калі база няякасная.

Важна наносіць тон раўнамерна і паўсюдна: каля вушэй, вакол вачэй і «спускаючыся» да шыі (уключаючы яе). Галоўнае — не расцягваць скуру, г. зн. не накладваць касметыку не па масажных лініях. Лепш за ўсё наносіць танальныя сродкі пэндзлікам, пажадана сінтэтычным, бо ён не ўбірае вадкасць. Ці можна выкарыстоўваць спецыяльны б'юціблэндар (спонж, якія выглядае, як яйка, звычайна руковае). Праўда, ён дарагаваты, але варты таго: дае лёгкае, незаўважнае пакрыццё.

Этап 4.

Маскіруем недахопы

«На кожны дзень выбраць лепей штосьці адно: ці кропкавы карэктар, альбо кансілер, ці толькі танальны сродак, — працягвае Настасся. — Інакш гэта ўжо прафесійны макіяж. Напрыклад, раніцай прачнулася, умылася, замаскіравала недахопы — сінякі пад вачыма, акнэ ці постакнэ — і пабегла. Ці ўмылася і нанесла тон».

Кансілер — гэта сродак для зоны вакол вачэй, карэктар — для астатніх недахопаў (ён больш шчыльны). Любы з іх можна наносіць пэндзлікам альбо пальчыкам, даючы сродку падсохнуць. Звычайна кансілер ці карэктар выбіраюцца на тон святлейшымі за танальны сродак альбо ў тон скуры.

— У макіяжы самае галоўнае — правільная растушоўка, што робіць касметыку непрыкметнай. Лепшы макіяж — калі ніхто яго не заўважае і дзяўчына проста добра выглядае, — лічыць візажыст.

Этап 5.

Скульптураванне

Самае балючае для прафесійнага вока візажыста — гэта падкрэсленыя рыжым колерам скулы. «Калі дзяўчына хоча зрабіць твар візуальна больш худым ці, наадварот, акруглым, то трэба выкарыстоўваць скульптар, але ён павінен быць не цёплага адцення, а блізкім да халоднага колеру ценю, які падае на скуру (ён не бывае рыжым)», — расказвае Настасся. Таксама ёсць такі сродак, як «бронзар». Тое ж, што і скульптар, толькі з блішчынкамі. Ён прызначаны для таго, каб падкрэсліць загар. Часта выкарыстоўваецца падчас фотасесій, але на кожны дзень будзе не да месца. Правільна падабраны колер скульптара — з той жа гамы, толькі на некалькі тонаў цямнейшы.

Можна выкарыстоўваць крэмавыя ці сухія сродкі. Першыя падыдуць для сухой скуры, для нармальнай і ўзроставай — другія. Калі пачынаем наносіць скульптар, то на твары трэба адшукаць самую цёмную кропку: перасячэнне ад кончыка брыва да вуха. Таксама можна дадаць крыху колеру на крылы носа. «Але на кожны дзень рабіць скульптураванне не варта. Бо гэта займае час (а раніцай ён на вагу золата), а калі перабольшыць з ім, то атрымаецца дрэнна. Таму толькі на вечар альбо для фотаздымкаў», — прапаноўвае Настасся Фёдарава.



Каб не расцягваць скуру, усе маніпуляцыі з тварам і шыяй трэба рабіць па масажных лініях

Этап 6.

Румяны і пудра

Румяны — гэта тое, што падыдзе для штодзённага макіяжу. Іх варта выбіраць па колеры вуснаў. Часцей за ўсё гэта персікавы ці ружовы колер. Яны ўніверсальныя, таму іх лёгка адшукаць у любой краме, што спецыялізуецца на касметыцы. Наносім наступным чынам: калі дзяўчына ўсміхаецца, утвараюцца «яблычкі» на шчоках. На іх наносім румяны, акуратна растушоўваем.

На кожны дзень пудра выкарыстоўваецца па жаданні і, перш за ўсё, для ўмацавання макіяжу. Лічыцца, што калі сухая скура, пудру лепей не выкарыстоўваць, каб не падкрэсліваць недахопы. У ідэале пудра павінна быць рассыпчатая і мінеральная, бо пад ёй скура дыхае, не забіваюцца поры. Таксама не карыстайцеся занадта насычанай пудрай, лепей узяць лёгкі варыянт. Пудру можна выкарыстаць і замест танальнага крэма. На ёй таксама не варта эканоміць: лепш набыць мінеральную марак Ardeco альбо Yves Rocher.

Этап 7.

Вусны, бровы, вейкі

Што датычыцца броваў, то тут самая частая памылка, калі яны ненатуральнай формы ці няправільна падабраны колер афарбоўкі. Калі форму мусіць фарміраваць майстар (гэта асобная тэма), то падфарбаваць іх можна ценямі для вачэй ці спецыяльнай памадкай для броваў. Расчэсваць іх варта шчоткай, на якую, каб лепей трымалі форму, можна пырснуць лакам для валасоў. З менш бюджэтных спосабаў можна назваць фіксуючы гель для броваў.

Туш, па словах Настассі, мусіць быць чорнай. Што тычыцца марак, якасці, кошту — гэта значэнне не мае. Галоўнае, каб яна не асыпалася і вас задавальняў пэндзлік. Спачатку з яго трэба зняць усё непатрэбнае, пры неабходнасці скарыстаўшыся сурвэткай (такім чынам пазбегнеце камякоў). Затым прафарбоўваем вейкі ад унутранай часткі да кончыкаў тонкімі слаямі адзін за адным — колькі лічыце патрэбным. Яны будуць выглядаць больш раздзеленымі. Падфарбоўваць ніжнія вейкі ці не — таксама справа кожнай жанчыны. Але, калі туш хутка абсыпаецца і ўтвараюцца «сінякі», лепей адмовіцца ад такой практыкі.

У фарбаванні вуснаў варта выкарыстоўваць цінты — вадкія, алейныя, жэлейныя, крэмавыя. Яны адрозніваюцца ад памады тым, што не сціраюцца падчас ежы ці пацалунку. Гэта канцэнтраваны пігмент, які пранікае ў вусны. Складваецца адчуванне, што яны сапраўды маюць такі прыродны колер, а не нафарбаваны.

Этап 8.

На вечар

Можна падфарбаваць вейкі крыху больш чым звычайна — накласці адзін ці два дадатковыя слаі. Таксама можна дадаць стрэлкі ці міжвейкавую падмалёўку. Стрэлкі трэба маляваць ад знешняга кутка вока ў кірунку да брыва: яны мусяць глядзець уверх. Спачатку малюецца контур, затым дафарбоўваецца сама стрэлка. Яна павінна менавіта падымацца ўверх. Гэта зробіць позірк больш адкрытым.

P.S. *Спадзяёмся, што парады Настассі Фёдаравай будуць карысныя і каштоўныя, падкрэсляць вашу прыродную прыгажосць і зробяць вас яшчэ больш прывабнай не толькі знешне, але і, дзякуючы самаадчуванню, унутрана.*

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

В соответствии с п.38 Устава ОАО «Барановичидрев» от 23.03.2011 года уведомляем о проведении внеочередного собрания акционеров Общества, которое состоится 28.12.2016 года в 14 часов 00 минут по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Повестка собрания:

1. О итогах работы ликвидационной комиссии Общества за период с 03.05.2016 года по 01.01.2017 г.

2. О продлении сроков ликвидации ОАО «Барановичидрев» до 31.12.2017 года.

3. О продлении полномочий ликвидационной комиссии и председателя ликвидационной комиссии до 31.12.2017 г.

Конт. тел. председателя ликвидационной комиссии Мищук А.М.: 8-029-6332490 vel; (029)-8248026 МТС;+375-163-453392

УНН 200299909

Свидетельство о государственной регистрации и печать ЧТУП «Керостат» (УНП 191440305) **считать недействительными** в связи с утерей.

Ликвидатор объявляет о проведении 14.01.17 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 29-1Н торгов по продаже имущества ЧУП «СарМин»:

1) административное помещение площадью 31,4 м² (офис), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Карастояновой, 32.

Начальная цена – 37 400 рублей. Шаг торгов - 5%.

Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется по реквизитам: р/с 3012000578739 ОАО «Белгазпромбанк», ЦБУ 742, код 742, ул. М. Богдановича, 116. УНП 191630863.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, г. Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н в срок по 31.12.16 г.

Справки по тел. 80296080101.

УНП 191228804

ИЗВЕЩЕНИЕ

Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова». Жилой дом № 7 по генплану»,

опубликованной в газете «Звязда» № 64 (28174) от 07.04.2016

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – декабрь 2016 года.

УНП 192400611

18 января 2017 г. **№2-А/2017**

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, (лет)	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку докум-ции, руб.
1	район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 338 по генплану)	340100000008002582	0,0784	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	охранная зона линий связи и радиофикации, сетей и сооружений канализации, водоснабжения	99	4 225 р. 98 коп. (42 259 795 р.)	211 р. 30 коп. (2 112 990 р.)	1 859 р. 81 коп. (18 598 100 р.)
2	район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 769 по генплану)	340100000008003164	0,0759	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	охранная зона линий связи и радиофикации	99	4 091 р. 22 коп. (40 912 225 р.)	204 р. 56 коп. (2 045 611 р.)	1 840 р. 65 коп. (18 406 500 р.)
3	ул. Киселева	340100000001006203	0,0466	для строительства здания специализированного общественного питания	охранная зона линий связи и радиофикации, сетей и сооружений канализации, электрических сетей, объектов газораспределительной системы	5	10 161 р. 82 коп. (101 618 223 р.)	508 р. 09 коп. (5 080 911 р.)	2 804 р. 90 коп. (28 049 000 р.)
4	район ул. Междугородняя и ул. Борисенко	340100000006006255	0,5390	для строительства и обслуживания объектов материально-технического снабжения	охранная зона электрических сетей	10	43 357 р. 18 коп. (433 571 790 р.)	2 167 р. 86 коп. (21 678 590 р.)	3 447 р. 39 коп. (34 473 900 р.)

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

